Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 СТУДЗЕНЯ 2017 г. АЎТОРАК № 20 (28384)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Як не папасціся інтэрнэт-ашуканцам?**

СТАР. 4




**Вёскі, якія знікаюць**

СТАР. 11



**Спектакль у папраўчай калоніі**

СТАР. 13

# Мужчынскі занятак



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

г. Давыд-Гарадок.




# ПЛАЦІНАВЫЯ ДАТЫ ГІСТОРЫІ

Як у музыцы адлюстравана 500-годдзе першай беларускай кнігі і першага перакладу Святога Пісання?

**Францыск Скарына і музыка — што можа звязваць галоўную постаць беларускага адраджэння і прыгожае гучанне?.. Што ігралі ў часы першадрукара? Ці слухаў ён сам музыку і дзе мог яе пачуць? Адказ на гэтыя і многія іншыя пытанні карэспандэнт «Звязды» атрымала ад лаўрэата міжнародных музычных конкурсаў, «галоўнага фагатыста» краіны, дырыжора Аляксея Фралова. 12 лютага ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі ён разам з Дзяржаўным камерным хорам, аркестрам «Capella Academia» і трыа «Вытокі» прадставіць праграму да 500-годдзя беларускай Біблії і беларускай Рэфармацыі «Напачатку было слова. Музычнае прысвячэнне Францыску Скарыну і Марціну Лютэру». А напярэдадні згадзіўся падзяліцца з нашымі чытачамі сваімі думкамі пра першадрукара і пра тое, якая музыка яго натхняла і атачала.**

СТАР. 8



Лаўрэат міжнародных конкурсаў, фагатыст і дырыжор Аляксей ФРАЛОЎ.

■ Працяг тэмы

# КАМУ ПЛАЦІЦЬ ЗА ЗЛІТЫЯ ЛІТРЫ?

**Летась у «Звяздзе» быў надрукаваны артыкул пра магіляўчаніна, які скардзіўся на тое, што яму прыходзіцца зліваць шмат халоднай вады з гарачага крана. Ён звяртаўся са сваёй праблемай у розныя інстанцыі. Прыходзілі камісіі, правяралі. Адны напісалі ў акце, што трэба зліць 6 літраў вады, пакуль яна набярэ неабходныя 50 градусаў, іншыя — 4,5 літра.**

— Я спраўна плачу па «лічыльніках», але пры гэтым губляю грошы адначасова на ўсіх «водных» паслугах — гарачай і халоднай вадзе, каналізацыі, паколькі тут усё ўзаемазвязана. Тым больш, што 4,5—6 літраў псеўдагарачай вады ў нікуды — гэта за раз, праз гадзіну кран адкрыў, а вада зноў пабегла халодная — труба ўжо астыла, — скардзіўся магіляўчанін, патрабуючы зрабіць пераразлік або нешта памяняць у самой канструкцыі водаразмеркавальнай сістэмы. У кватэрах на апошніх паверхах разводка гарачай вады зроблена з улікам яе распаветрывання.

Ва ўпраўленні ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама карэспандэнту «Звязды» патлумачылі, што дом, дзе жыве грамадзянін, мае сістэму рэцыркуляцыі. Гэта значыць, што 10-працэнтная зніжка на гарачую ваду тут не прадугледжана. А зрабіць пераразлік немагчыма, бо няма такой методыкі.

— Мы толькі ўмоўна палічылі магіляўчаніну страты з разліку, што ў дзень зліваецца 4,5 літра вады, памножылі на колькасць дзён у месяцы і атрымалася, што жыхар губляе на гарачай вадзе 10 капеек, на каналізацыі 6-7. Але, паўтаруся, гэта ўсё чыста ўмоўна. Заканадаўствам пераразлік у такіх выпадках не прадугледжаны, — патлумачыла **галоўны спецыяліст упраўлення ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама Марына ПАДГЛАЗАВА.**

## ПЫТАННЕ ТЭХНІЧНАГА ПЛАНА

Магіляўчанін працягвае адстойваць свае інтарэсы. У пачатку студзеня ён прыйшоў на прыём да губернатара Уладзіміра Даманеўскага, а ў мінулую пятніцу падчас круглага стала, дзе разглядаўся стан спраў у сістэме ЖКГ у маштабах вобласці, у карэспандэнта «Звязды» была магчымасць задаць набалелае пытанне **намесніку міністра ЖКГ Генадзю ТРУБІЛУ.**

— Калі ёсць сістэма рэцыркуляцыі гарачага водазабеспячэння, гэта значыць, што астывае толькі адгалінаванне ад стаяка з гарачай вадой да крана, — патлумачыў ён. — Можа, трэба разгледзець магчымасць паменшыць гэтую адлегласць або прапанаваць нешта яшчэ. Грамадзянін на падставе закона аб абароне праў спажыўцоў можа прад'явіць прэтэнзію да арганізацыі, якая эксплуатуе жыллёвы фонд. Даказаць, што паслуга не якасная. Але трэба разумець, што амаль увесь наш жыллёвы фонд — гэта спадчына Савецкага Саюза. Сёння можна мадэрнізаваць тэхналогіі, якія выкарыстоўваліся пры будаўніцтве гэтых дамоў, аднак трэба глядзець і эканамічны эфект ад гэтага. Калі вырашэнне пытання грамадзяніна патрабуе нязначных тэхнічных выдаткаў, то паглядзець можна. Калі не, растлумачыць — чаму.

СТАР. 6

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл АМЕЛЬЯНОВІЧ, міністр лясной гаспадаркі**

*«Беларуская прадукцыя запатрабаваная за мяжой. Прадпрыемствы канцэрна «Беллеспаперапрам», якія прайшлі мадэрнізацыю, вырабляюць якасную, экспартна арыентаваную прадукцыю. Стаўка робіцца на прадукцыю з высокім дабаўленым коштам. Вядома, кожная краіна зацікаўленая ў тым, каб перапрацоўваць сваю сыравіну на ўнутраным рынку, пастаўляць прадукцыю на экспарт і атрымліваць фінансавыя сродкі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9357 | ▼ |
| Еўра | 2,0723 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0321 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0714 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Парламенцкі дзённік

# МЫ НЕ МАЛАДЗЕЕМ...

## Як павінна ўдасканальвацца пенсійная сістэма

**Летась тэма пенсій і павышэння пенсійнага ўзросту была ці не самай абмяркоўваемай. Сёлета накал трошкі знізіўся, але тым не менш тэма ўсё яшчэ актуальная. У Палаце прадстаўнікоў Пастаянная камісія па працы і сацыяльных пытаннях арганізавала круглы стол пра стан і перспектывы развіцця пенсійнай сістэмы ў нашай краіне.**

**Тамара КРАСОЎСКАЯ, старшыня названай Пастаяннай камісіі,** у размове з журналістамі расказала, што людзі ледзь не кожны дзень пішуць звароты: чаму неабходна ўдасканаленне пенсійнай сістэмы і што яе чакае ў будучыні?

— Важна ўсім тлумачыць, асабліва маладым людзям: сваю працоўную дзейнасць трэба пачынаць з чыстай працоўнай кніжкі, каб добранадзейны наймальнік штомесяц пералічваў грашовыя выплаты ў страхавы фонд. Гэта неабходна для таго, каб чалавек быў забяспечаны ў старасці. Менавіта працэс удасканалення пенсійнай сістэмы высвеціў такія негатыўныя моманты, як працоўная дзейнасць у ценявой эканоміцы. Гэта не дазваляе людзям у будучыні прэтэндаваць на працоўны стаж і працоўную пенсію, — сказала яна.

Зразумела, што апошняя напрамую залежыць ад працоўнай актыўнасці.

— Сем-восем гадоў будуць адбывацца тыя змены ў пенсійнай сістэме, якія запісаны ва Указе Прэзідэнта, — адзначыла парламентарый, адказваючы на пытанне пра магчымасць рэформы пенсійнай сістэмы. — Але гэта не сведчыць, што ў бліжэйшай перспектыве будзе нейкая рэформа. Ніякіх рэформ не будзе. Мы павінны апрабаваць змены, якія адбыліся ў сучаснай мадэлі нашай пенсійнай сістэмы. Мы зробім гэта з улікам меркавання людзей, дэпутатаў, усіх прадстаўнікоў дзяржавы. Мы будзем глядзець, якія карэктывы будзе ўносіць само жыццё.

**Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны,** гаворачы пра магчымую колькасць людзей, што працуюць у ценявой эканоміцы, падкрэсліў: аб'ём апошняй не можа праілічыць дакладна ні адна краіна свету.

Па яго словах, у апошнія гады ўсё ўдасканаленне пенсійнай сістэмы адбываецца з улікам дэмаграфічнай сітуацыі.

— Сёння ў нас ужо 27% насельніцтва — пенсіянеры, мы павінны гэта прызнаць, — аргументаваў намеснік міністра. — Гэта лічба па прагнозах дэмографаў будзе прагрэсаваць расці, калі мы нічога не зробім. Мы павысілі пенсійны ўзрост, каб трошкі прыпыніць прырост колькасці пенсіянераў. У нас толькі за апошнія шэсць гадоў у пенсійную сістэму дадалося 165 тысяч новых пенсіянераў. Што да ценявой эканомікі, то гэта балючае пытанне, у прыватнасці, пенсійная сістэма адаптуецца і да гэтай праблемы праз павышэнне страхавога стажу.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Класныя навіны

**Ігар КАРПЕНКА:**

# «ЗАДАЧА БАЦЬКОЎСКІХ КАМІТЭТАЎ — НЕ ЗБОР ГРОШАЙ...»

**«Профільнае навучанне ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі павінна арганізоўвацца рацыянальна», — такое меркаванне выказаў міністр адукацыі Ігар Карпенка, прымаючы ўдзел у калегіі ўпраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама.**

— Профільнае навучанне — гэта ў першую чаргу стварэнне магчымасцяў для хлопчыкаў і дзяўчатак, якія паказваюць высокія вынікі ў вучобе і арыентаваны на ВНУ. Але не варта гэтым захапляцца, — растлумачыў сваю думку Ігар Карпенка.

Яшчэ адзін аспект, які закрануў міністр на калегіі, датычыцца адказнасці заказчыкаў кадраў: «Нонсэнс атрымліваецца! Калі студэнт ВНУ або сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы не паедзе па размеркаванні, з яго спаганяюць грошы. А калі работадаўца заказаў падрыхтоўку кадраў за дзяржбюджэт, а потым адмаўляецца ад прыёму на работу маладых спецыялістаў, — ён не нясе ніякай адказнасці. Па маім разуменні, тады вярні гэтыя грошы ў бюджэт. Мы іх выдаткуем на перапрафіляванне кадраў, на адкрыццё новых спецыяльнасцяў... Лічу, што гэта пытанне міжведамаснага ўзаемадзеяння».

Ігар Карпенка паведаміў, што паралельна з падрыхтоўкай змяненняў у Кодэкс «Аб адукацыі» цяпер вядзецца работа над яшчэ адным дакументам, што датычыцца дэталёвай класіфікацыі спецыяльнасцяў у ВНУ і ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі. «Мы хочам прааналізаваць — ці павінны кваліфікацыйныя характарыстыкі ў сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі дублявацца ў вышэйшай школе і наадварот. Вось у медыкаў усё дакладна выбудавана. У сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі ёсць спецыяльнасці «медсястра», «фельчар», «лабарант». Яны не дублююць спецыяльнасці ў вышэйшай школе. А мы па некаторых спецыяльнасцях — такіх як «тэхнолаг» або «педагог дашкольнай адукацыі» — рыхтуем і ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах, і ва ўніверсітэтах», — падкрэсліў ён.

Больш уважліва трэба пагледзець і на сістэму падрыхтоўкі кадраў. Напрыклад, з дзецьмі, якія маюць асаблівасці развіцця, сёння пераважна працуюць толькі спецыялісты, якія навучаліся ў Інстытуце інклюзіўнай адукацыі. Тыя ж настаўнікі-прадметнікі (гісторыі, матэматыкі або фізікі) не маюць неабходных ведаў і навыкаў для работы з такімі асаблівымі дзецьмі. А гэта неабходна, калі гаворка ідзе аб стварэнні ў школе інтэграваных класаў і інклюзіўнага асяроддзя. І ў гэтай сітуацыі, як растлумачыў міністр адукацыі, аптымальна набіраць групу педагогаў і дадаткова навучаць іх рабоце з дзецьмі, якія маюць асаблівасці ў развіцці.

Падчас сваёй трохдзённай паездкі ў Брэсцкую вобласць міністр наведаў шэраг устаноў адукацыі. Апошнім пунктам візіту стала сярэдняя школа № 1 горада Жабінкі, дзе міністр закрануў праблему эфектыўнага ўзаемадзеяння бацькоў з педагогамі, расказаў пра ўкараненне электроннай школы і дзейнасць папячыцельскіх саветаў. Ігар Карпенка адзначыў, што галоўная задача бацькоўскіх камітэтаў і папячыцельскіх саветаў школ заключаецца не ў зборы грашовых сродкаў, а перш за ўсё ў сумесным удзеле ў вырашэнні розных праблем адукацыйнага працэсу, асабліва ў выхаванні моладзі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Тэракт у Квебеку

**Невядомыя адкрылі стральбу ў нядзелю падчас вячэрняй малітвы ў мячэці ў канадскай правінцыі Квебек. Як мінімум пяць чалавек загінулі ў выніку ўзброенага нападзення, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Са слоў кіраўніка ісламскага культурнага цэнтра, стральба пачалася на першым паверсе, пасля чаго злачынец падняўся на другі паверх. Прэм'ер-міністр Канады Джасцін Трудо назваў стральбу ў мячэці Квебека «баязлівым нападзеннем».

## ЗША — Расія: агульныя інтарэсы

**Размова лідараў РФ і ЗША Уладзіміра Пуціна і Дональда Трампа, якая прайшла ў суботу, выявіла шэраг сфер, у якіх інтарэсы дзвюх краін супадаюць, заявіў кіраўнік МЗС Расіі Сяргей Лаўроў.**

Прэзідэнты РФ і ЗША ў тэлефоннай размове абмеркавалі цэлы шэраг пытанняў, уключаючы сітуацыю ў Сірыі і ва Украіне. Сярод іншага адзначылі важнасць аб'яднання намаганняў у барацьбе з міжнародным тэрарызмам.

## Грузія і Расія хочуць аднавіць дыпаднosіны

**Спецыяльны прадстаўнік грузінскага прэм'ера па сувязях з Расіяй Зураб Абашыдзэ заявіў, што пры пэўных умовах Масква і Тбілісі могуць вярнуцца да пытання аднаўлення дыпламатычных адносін.**



Грузія разарвала дыпадносіны з Расіяй у жніўні 2008 года ў адказ на прызнанне незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Аднак прадстаўнікі ўрада краіны, якія прыйшлі да ўлады ў кастрычніку 2012 года, назвалі нармалізацыю адносін з Масквой адным з галоўных прыярытэтаў знешняй палітыкі.

## Прэзідэнт Філіпін Дутэртэ прыпыніў вайну з наркотыкамі

**Ён заявіў, што «збянтэжаны» фактамі злоўжывання ўладай з боку кіраўніцтва антынаркатычных службаў, якія ў выніку прывялі да выкрадання і забойства грамадзяніна Паўднёвай Карэі Чы Іч Чу, піша The Guardian.**

Падраздзяленні паліцыі Філіпін па барацьбе з наркотыкамі былі расфармаваныя пасля таго, як паліцэйскія забілі паўднёвакарэйскага бізнесмена. Прэзідэнт краіны Радрыга Дутэртэ паабяцаў, што вайна з наркотыкамі будзе працягвацца да заканчэння яго тэрміну ў 2020 годзе, але цяпер актыўны дзеянні прыпыняюцца з-за карумпаванасці паліцэйскіх.

Падазраваныя ў забойстве бізнесмена ўсё яшчэ застаюцца на свабодзе. Дутэртэ даў 48 гадзін на тое, каб знайсці іх жывымі ці мёртвымі. За выяўленне падазраваных абяцаная ўзнагарода ў памеры пяці мільёнаў песа (100 тысяч долараў).

## Гарбачоў выпіў гарэлкі з Венядзіктавым і «атакаваў» яго кіем

**Галоўны рэдактар радыёстанцыі «Эхо Москвы» Аляксей Венядзіктаў прыняў удзел у застоллі з экс-прэзідэнтам СССР Міхаілам Гарбачовым.**



Венядзіктаў размясціў у сацсетках фатаграфіі сяброўскай сустрэчы з Міхаілам Гарбачовым за столікам маскоўскага рэстарана. Палітык і журналіст выпілі гарэлкі (як піша журналіст, «па бутэльцы на брата») пад закуску з сыру і вінаграду. Фатаграфію Венядзіктаў выклаў у Instagram і Twitter: «Сядзім ва Украіне», — растлумачыў кіраўнік «Эхо Москвы».

Падагрэтае алкаголем застолле перайшло ў эмацыйную сяброўскую гутарку. На адным са здымкаў відаць, як Гарбачоў замахваецца на Венядзіктава сваім кіёчкам. «Прэзідэнты атакуюць», — напісаў журналіст пад фатаграфіяй.

■ Акцэнты тыдня



# Бяспека перш за ўсё

**Тэрарыстычны акт** узрушыў мірную Канаду. У нядзелю ў Ісламскі культурны цэнтр у Квебеку ўварваліся ўзброеныя людзі і адкрылі стральбу. Ёсць інфармацыя пра загінулых. Прэм'ер-міністр Канады Джасцін Трудо назваў тэрарыстычную атаку баязлівым нападам. Двое з нападаючых былі забітыя, аднаму, паводле папярэдняй інфармацыі, удалося ўцячы. Гэта самы гучны тэракт у Канадзе з моманту атакі 2014 года, калі тэрарысту ўдалося пракрасціся ў парламент.

Тэракт у Канадзе можа сыграць на руку новаму прэзідэнту ЗША Дональду Трампу. Ён якраз паспеў выдаць **указ аб узмацненні жорсткасці іміграцыйнай палітыкі,** які шырока абмяркоўваецца. Цяпер уезд у Злучаныя Штаты часова забаронены грамадзянам сямі мусульманскіх краін Блізкага Усходу і Афрыкі — Ірана, Ірака, Емена, Лівіі, Сірыі, Самалі і Судана. Нельга ўехаць з гэтых дзяржаў і ўладальнікам грын-карт (пасведчанняў на права жыхарства ў ЗША). Адразу пасля прыняцця ўказа сотні грамадзян гэтых краін перасталі пускаць на рэйсы ў ЗША і прадаваць ім білеты на палёты ў гэтым напрамку. Таксама ЗША на 120 дзён замарозілі праграму па прыняцці бежанцаў з Сірыі. Прэзідэнт Трамп абвясціў аб рашэнні ствараць мірныя зоны на тэрыторыі самой Сірыі, каб не прымаць больш бежанцаў на амерыканскай тэрыторыі. Указ падвергся шырокай крытыцы, у тым ліку і з боку вядомых прадстаўнікоў самой Рэспубліканскай партыі. Дзясяткі тысяч пратэстоўцаў выйшлі на вуліцы гарадоў. Сам амерыканскі прэзідэнт аб'явіў, што гэтая мера часовая, і праз тры месяцы татальныя абмежаванні супраць жыхароў сямі краін будуць зняты. А палітыка выдачы амерыканскіх віз у дачыненні да жыхароў усіх краін будзе перагледжана.

На мінулым тыдні таксама адбылася **тэлефонная размова Дональда Трампа з Уладзімірам Пуціным,** якой многія чакалі ў надзеі, што напружанне паміж ЗША і Расіяй пры новым прэзідэнце пачне спадаць. Прыкметы гэтага ёсць — Дональд Трамп ужо некалькі разоў заявіў пра тое, што адмена санкцый магчымая. На жаль, у самой гутарцы тэма санкцый не абмяркоўвалася. Пазітывам стала тое, што бакі адшукалі пункты для супрацоўніцтва. Абмяркоўваліся канфлікты ў Сірыі і ва Украіне, падымаліся пытанні аб магчымасці асабістай сустрэчы і мерах па ўмацаванні эканамічных сувязяў. Сама працягласць размовы — 45 хвілін — дазваляе спадзявацца на змены да лепшага ў будучыні. Бакі з'яўляюцца аб'ектыўнымі саюзнікамі ў барацьбе з сусветным тэрарызмам, якая мае такое вялікае значэнне для новага амерыканскага прэзідэнта.

**Калінінградская вобласць і Вільнюская вобласць** сталі аб'ектам абмеркавання ў выступленнях двух парламентарыяў — Літвы і Расіі. 20 студзеня дэпутат сейма Літвы, Лінас Бальсіс, вядомы за межамі краіны больш як былы прэс-сакратар літоўскага прэзідэнта Далі Грыбаўскайтэ, заявіў пра неабходнасць абмяркоўваць пытанне аб адлучэнні Калінінградскай вобласці ад Расіі, у сувязі з тым, што яна не была перададзена Расіі назаўсёды. Першы намеснік старшыні камітэта Савета Федэрацыі па міжнародных справах Уладзімір Джабараў 29 студзеня ў адказ прапанаваў вярнуць Расіі Вільнюскі край, які ўвайшоў у склад Літвы толькі па выніках Другой сусветнай вайны. Гэтая віртуальная дыскусія стала яшчэ адным пацвярджэннем таго, што некаторыя палітыкі ЕС зусім не нацэлены на пошук кампрамісаў у стасунках з Расіяй, якія маглі б садзейнічаць зніжэнню напружання ў рэгіёне, а, наадварот, шукаюць штучныя зачэпкі для абвастрэння праблем. У той жа час пазітывам з'яўляецца рост колькасці тых палітыкаў у Еўрасаюзе, якія гатовыя ісці курсам на аслабленне напружанасці. У пачатку мінулага тыдня кіраўнік МЗС Венгрыі Петэр Сіярта заявіў, што антырасійскія санкцыі «неэфектыўныя і шкодныя» і наносяць вялікі ўрон экспарту тавараў з Венгрыі. Ён спадзяецца, што санкцыі могуць змякчыцца, калі будзе ў наяўнасці курс на паляпшэнне адносін паміж ЗША і Расіяй.

Для еўразійскай бяспекі важна тое, што ў апошнія гады **ўмацаваліся адносіны Кітая і Расіі.** Пацвярджэннем таму сталі падзеі мінулага тыдня. 23 студзеня кітайская газета Global Times напісала, што Кітай размясціў міжкантынентальныя балістычныя ракеты Dongfeng-41 (DF-41) у паўночна-ўсходняй правінцыі Хэйлунцзян, якая мяжуе з Расіяй. Крэмль дастаткова хутка адрэагаваў. Прэс-сакратар расійскага прэзідэнта Дзмітрый Пяскоў ужо на наступны дзень заявіў, што «ваеннае будаўніцтва ў Кітаі не ўспрымаем як пагрозу нашай краіне». Ён таксама падкрэсліў, што Кітай з'яўляецца «нашым стратэгічным саюзнікам, нашым партнёрам і ў палітычным, і ў гандлёва-эканамічным плане». 25 студзеня на брыфінгу прэс-сакратар МЗС КНР Хуа Чунін назвала інфармацыю аб размяшчэнні ракет здагадкамі карыстальнікаў Інтэрнэту. Пры гэтым яна адзначыла «вельмі пазітыўны, прамалінейны і канструктыўны» каментарый расійскага боку, які характарызуе высокі ўзровень даверу паміж краінамі.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

**ПРАМАЯ ЛІНІЯ**

**УСЁ АБ ЖЫЛЛЁВЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ**

Ці падлягае падаткаабкладанню падораная кватэра? Ці можна прадаць кватэру, пабудаваную з дапамогай ільготнага крэдытавання? Як падзяліць асабовыя рахункі? Што рабіць, калі суседзі пастаянна шумяць? Ці магчыма выселіць уласніка з кватэры?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на прамой тэлефоннай лініі госцю нашай рэдакцыі — **адвакату спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі №3 па прававым забеспячэнні здзелак з нерухомасцю Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Святлане КАСЦЕВІЧ.**

Прамая лінія пройдзе 2 лютага з 11 да 12 гадзін. Наш тэлефон 8 (017) 287-18-71.

***Папярэднія пытанні можаце задаваць 31 студзеня і 1 лютага па тэлефоне 8 (017) 287-18-29 у працоўны час альбо 2 лютага з 10 да 11 гадзін па тэлефоне 8 (017) 287-18-71. Або можаце даслаць свае пытанні (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by ці па пошце: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.***

# З 1 ЛЮТАГА ВЫРАСЦЕ БПМ

**Бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва з 1 лютага ўстаноўлены ў памеры 180 рублёў 10 капеек. Ён будзе дзейнічаць да 30 красавіка 2017 года.**

Бюджэт пражытковага мінімуму для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп з 1 лютага складзе:

— для працаздольнага насельніцтва — 198 рублёў 63 капейкі;

— для пенсіянераў — 138 рублёў 80 капеек;

— для студэнтаў — 175 рублёў 24 капейкі;

— для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 116 рублёў 83 капейкі;

— для дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 160 рублёў 61 капейка;

— для дзяцей ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў — 197 рублёў 40 капеек.

У сувязі са змяненнем БПМ з 1 лютага павялічацца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі; надбаўкі, павышэнні да пенсій і даплаты асобам ва ўзросце 75 гадоў і вышэй; дапамогі па доглядзе за інвалідам І групы або за асобай, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

Вырастуць таксама некаторыя віды дапамог на дзяцей: пры нараджэнні дзіцяці (першага дзіцяці — 10 БПМ, другога і наступных дзяцей — 14 БПМ); па доглядзе за дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў (1 БПМ); на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў (0,5 БПМ), на дзяцей старэйшых за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў (0,5 БПМ, 0,7 БПМ), на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека (0,7 БПМ), а таксама іншыя сацыяльныя выплаты, якія вылічваюцца з памеру БПМ.

***

Яшчэ адным сацыяльным нарматывам для прагназавання змянення ўзроўню жыцця і ўзмацнення сацыяльнай падтрымкі з'яўляецца мінімальны спажывецкі бюджэт.

Памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў з 1 лютага складуць:

— для працаздольнага насельніцтва — 383 рублі 34 капейкі;

— для пенсіянераў — 301 рубель 45 капеек;

— для студэнтаў — 287 рублёў 93 капейкі;

— для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 241 рубель 51 капейка;

— для дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў— 312 рублёў 69 капеек;

— для дзяцей ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў — 326 рублёў 47 капеек;

— для сям'і з чатырох чалавек — 298 рублёў 85 капеек;

— для маладой сям'і з трох чалавек — 323 рублі 74 капейкі.

Сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек служыць асновай для вызначэння права грамадзян на атрыманне льготных крэдытаў і субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў; а для грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тыс. чалавек, — ільготных крэдытаў на капітальны рамонт і рэканструкцыю жылых памяшканняў, будаўніцтва інжынерных сетак, узвядзенне гаспадарчых памяшканняў і пабудоў, а таксама для вызначэння іншых сацыяльных стандартаў.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## ■ Словы на ўспамін

# ЁН ДА АПОШНЯГА ВЫСТУПАЎ...

Учора ў Мінску развіталіся з народным артыстам Беларусі Аляксандрам Ціхановічам

**Яго сэрца перастала біцца ноччу 28 студзеня. Спеваку было 64 гады. Развітальная паніхіда адбылася ў Мінску ў храме Аляксандра Неўскага, у якім Ціхановіч быў не толькі прыхаджанінам, але і пеўчым. Пахаваны спявак на Усходніх могілках сталіцы.**



Пра смерць бацькі паведаміла дачка музыкі спявачка Анастасія Ціхановіч:

«Сёння ноччу не стала майго таты... Мы дзякуем усім, хто на працягу яго дзівоснага жыццёвага шляху быў побач. Дзякуем усім, хто маліўся і падтрымліваў яго ў апошні вельмі няпросты год. Я ведаю, што ён бы папрасіў аддзячыць за вашу любоў, якая была ўзаемнай. Чалавек-любоў, мой самы блізкі, самы лепшы, самы любімы... Няхай Бог прыме цябе ў Сваіх самых светлых сялібах, дзе няма больш ні хваробы, ні смутку, але жыццё і любоў бясконцая...»

Жонка спевака Ядвіга Паплаўская даведалася пра смерць мужа, знаходзячыся на гастролях у Ізраілі. Яна адразу ж вярнулася, каб развітацца. Як паведамляюць родныя, спявак хварэў на рэдкую хваробу — аўтаімуннае захворванне лёгкіх. Звычайна з ёй жывуць тры-чатыры гады, Ціхановіч пратрымаўся сем.

Ён да апошняга моманту імкнуўся быць актыўным, выступаць. Свой апошні канцэрт адпрацаваў 13 студзеня на прэзідэнцкім балі. А на наступны дзень трапіў у бальніцу. Знаходзіўся пад кіслароднай маскай два тыдні, а калі яе здымалі, стараўся ўсміхацца і падбадзёрваць родных. Заўсёды трымаўся вельмі мужна...

Аляксандр Ціхановіч доўгі час спяваў у легендарным ансамблі «Верасы», дзе пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Ядвігай Паплаўскай. Пазней яны разам стварылі Тэатр песні і творчую студыю пры ім, праз якія прайшлі многія маладыя беларускія выканаўцы. Ціхановіч быў аўтарам і вядучым некалькіх музычных тэлевізійных праектаў. З 2006 па 2009 год узначальваў нацыянальны тэлевізійны музычны праект «ЕўраФэст» і беларускі адборачны тур на міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне». Слухачы не толькі з Беларусі, але і з усяго былога Савецкага Саюза назаўсёды запомняць яго па песнях «Малінаўка», «Завіруха», «Цыганка раз, цыганка два», якія спявак выконваў разам з жонкай.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў словы падтрымкі родным і блізкім Аляксандра Ціхановіча:

«Прыміце мае глыбокія спачуванні ў сувязі з адыходам з жыцця выдатнага музыканта і цудоўнага чалавека. Аляксандр Ціхановіч упісаў незабыўную старонку ў гісторыю айчыннай эстрады, песні ў яго выкананні сталі залатымі шлягерамі на ўсе часы. Чалавек вялізнага таленту і шчодрай душы, ён выхаваў цэлую плеяду яркіх маладых артыстаў і быў прыкладам адданасці мастацтву і сваім слухачам. Светлая памяць пра Аляксандра Ціхановіча застанецца ў нашых сэрцах».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

***Супрацоўнікі РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» смуткуюць з нагоды смерці народнага артыста Беларусі Аляксандра Ціхановіча і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.***

# ДРУГАСНЫЯ РЭСУРСЫ

## З адходаў можна рабіць нават паліва

**З 2 лютага па 3 сакавіка дзяржустанова «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» праводзіць грамадскія абмеркаванні праекта Нацыянальнай стратэгіі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі ў Беларусі на перыяд да 2035 года.**

Трэба адзначыць, што стварэнне гэтага праекта вызначана Дзяржаўнай праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады, а распрацоўшчыкамі яго сталі спецыялісты таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЭкаРысайклінг» і эксперты Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».

Дарэчы, такая Нацыянальная стратэгія распрацоўваецца ў нашай краіне ўпершыню, а мэтай яе падрыхтоўкі з'яўляецца фарміраванне асноўных кірункаў мінімізацыі шкоднага ўздзеяння цвёрдых камунальных адходаў на здароўе чалавека і на навакольнае асяроддзе. Асобная ўвага ў дакуменце звяртаецца на рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў — з максімальна магчымым атрыманнем карысных кампанентаў, якія ўтрымліваюцца ў адходах (арганіка, металалом, папера, шкляная і пластыкавая тара, тэкстыль, зношаныя аўтамабільныя шыны і іншыя). Потым такія кампаненты прадугледжваецца выкарыстоўваць у гаспадарчым абароце ў якасці дадатковых крыніц сыравіны, матэрыялаў, паўфабрыкатаў, іншых вырабаў або прадуктаў для вытворчасці тавараў (прадукцыі) і выканання работ. Таксама адным з кірункаў прадугледжваецца выкарыстанне энергапатэнцыялу з цвёрдых камунальных адходаў у выглядзе паліва RDF, цеплавой і электрычнай энергіі.

Праект размешчаны на сайце ўстановы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» www.vtoroperator.by у раздзеле «Грамадскія абмеркаванні». Дадатковую інфармацыю можна знайсці на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале краіны www.pravo.by у раздзеле «Навіны pravo.by».

Арганізатар грамадскіх абмеркаванняў паведамляе, што заўвагі і прапановы па праекце Нацыянальнай стратэгіі прымаюцца на адрас дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» (вул. Кальварыйская, 25, 220073, г. Мінск), або іх прапануецца накіроўваць на e-mail: kudyrko@vtoroperator.by.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

***P.S.***

*Парадак накіравання заўваг і прапаноў вызначаны ў Палажэнні аб парадку арганізацыі і правядзення грамадскіх абмеркаванняў праектаў экалагічна значных рашэнняў, справаздач аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, уліку прынятых экалагічна значных рашэнняў, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2016/07/14 № 458.*

## ■ Надвор'е

# МЯККІ ЛЮТЫ, ЧАСАМ З ПЛЮСАМ

**Спецыялісты прагназуюць, што тэмпературны фон на гэтым тыдні будзе на 3—5 градусаў вышэй за норму**

**А ўвогуле, у бліжэйшыя 5 дзён на тэрыторыі краіны чакаецца спакойнае і слабамарознае, але сырое надвор'е, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Сіноптык патлумачыў, што надвор'е ў нас у асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, якая сфарміравана ў вільготнай паветранай масе. Сёння ў асобных раёнах, пераважна па поўначы краіны, пройдзе невялікі снег. Месцамі на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень складзе мінус 1—7 градусаў. У сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы і раніцай у паўночна-ўсходніх раёнах Беларусі магчымы невялікі снег. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 марозу, пры праясненнях чакаецца да мінус 12 градусаў, а ўдзень прагназуецца ад нуля да мінус 5 градусаў. Амаль не будзе ападкаў і ў чацвер, толькі ўдзень у паўднёва-заходніх раёнах краіны магчымы кароткачасовы мокры снег і дождж. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да мінус 8 градусаў, пры праясненнях — да 10 марозу, удзень — ад мінус 4 да плюс 3 градусаў.

Сіноптыкі адзначаюць, што надалей да нас завітае атмасферны фронт, які будзе перамяшчацца цераз Беларусь з паўднёвага захаду Еўропы. Таму ў пятніцу ў асобных раёнах краіны пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, магчымы слабы туман, галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, пры праясненнях — да мінус 9 градусаў, а ўдзень чакаецца ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у выхадныя дні ў асобных раёнах краіны пройдзе невялікі снег, мокры снег, чакаецца слабы галалёд, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 7 градусаў, пры праясненнях будзе 8—12 марозу, аднак удзень чакаецца толькі да 6 марозу да 1 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю народнага артыста Рэспублікі Беларусь Аляксандра ЦІХАНОВІЧА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім. Памяць пра выдатнага чалавека і музыканта назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне ў сувязі са смерцю народнага артыста Беларусі Аляксандра Рыгоравіча ЦІХАНОВІЧА яго родным і блізкім.**

**Кіраўніцтва і калектыў супрацоўнікаў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі з заўчаснай смерцю народнага артыста Беларусі Аляксандра Рыгоравіча ЦІХАНОВІЧА і выказваюць шчырыя спачуванні родным, блізкім, сябрам і ўсім прыхільнікам вялікага артыста.**

**Рэдакцыя газеты «Звязда» глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю нашага пастаяннага аўтара, члена Беларускага саюза журналістаў Таццяны Леанідаўны КУЗЬМІЧ і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыцы.**

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:

- квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№8687758, 0917633, 3480983, 3484693 и серии СВ №№0204057, 0204991;

- полис по добровольному страхованию имущества физических лиц; добровольному страхованию гражданской ответственности владельцев квартир формы 2РН, 2РП серии БИ №0039060;

- полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БИ №№1573678, 1485562, 1531661, 1546715, 1568517, 1579947, 1588719, 1606266, 1606291, 1606292, 1612280, 1612300, 1617141, 1032845-1032848, 1285901-1285905, 1267323.

УНП 100782388

■ Сітуацыя

■ Грамадства

## У МУС З'ЯВІЛІСЯ ФУНКЦЫІ КОНСУЛЬСТВА

Зменены некаторыя адміністрацыйныя працэдуры, якія выконваюцца падраздзяленнямі па грамадзянстве і міграцыі

**Новаўвядзенні закрануць як замежнікаў, што пражываюць у Беларусі, так і грамадзян Беларусі, якія адпраўляюцца на пастаяннае пражыванне за мяжу.**

Як паведаміла прэс-служба МУС, з 1 студзеня гэтага года ўжо ўступілі ў сілу нормы, якія прадугледжваюць выдачу двухразовай візы для выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў нашу краіну замежным грамадзянам або асобам без грамадзянства, якія часова ці пастаянна тут пражываюць, але не маюць сапраўднага пасведчання на жыхарства. Гэта дазволіць органам унутраных спраў выдаваць двухразовыя візы, аналагічна консульскім установам Рэспублікі Беларусь за мяжой.

З пачатку гэтага года права на атрыманне дакумента аб шматразовым запрашэнні замежніка ў Рэспубліку Беларусь з'явілася і ў замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у краіне, — нароўні з беларускімі грамадзянамі.

Павялічыўся памер дзяржаўнай пошліны за выдачу пашпарта для пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь грамадзянам, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту. Да 5 базавых велічынь — для ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, пенсіянераў, інвалідаў, да 10 базавых велічынь — для іншых грамадзян.

З 26 красавіка 2017 года ўступяць у сілу змены, якія датычацца павелічэння да 1 базавай велічыні дадатковай платы за выдачу і абмен пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або віду на жыхарства замежнага грамадзяніна і асобы без грамадзянства за 15 дзён з дня падачы заявы (у паскораным парадку). У падраздзяленнях па грамадзянстве і міграцыі, размешчаных у горадзе Мінску і абласных цэнтрах, з названай даты за 7 дзён з дня падачы заявы (у тэрміновым парадку) выдадуць або абмяняюць пашпарт або від на жыхарства пры дадатковай плаце ў памеры 2 базавых велічынь.

Таксама з 26 красавіка 2017 года ва ўсіх падраздзяленнях па грамадзянстве і міграцыі ўводзіцца тэрміновы парадак (1 дзень з дня падачы заявы) для выдачы візаў замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства і запрашэнняў у Рэспубліку Беларусь. У гэтых выпадках памер дадатковай платы складзе 3 базавыя велічыні.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

# КАЛІ ТАННЫЯ КВАТЭРЫ, НЕЧАКАНАЯ СПАДЧЫНА І ЛЁГКІЯ ЗНАЁМСТВЫ — БЯДА

## Як не трапіць на вудачку інтэрнэт-ашуканцам

**Сусветнае павуцінне — адно з найвялікшых вынаходак чалавецтва: інтэрнэт дае мноства магчымасцяў для атрымання ведаў, самаразвіцця і зносін, аднак шанц застацца ананімным і распаўсюджанасць сеткі ва ўсім свеце ствараюць шырокі прастор для з'яўлення розных злачынных схем. Прычым пацярпелым можа аказацца любы занадта даверлівы ці неасцярожны чалавек.**



Першае высокатэхналагічнае злачынства на тэрыторыі нашай краіны было зарэгістравана амаль 20 гадоў таму. На працягу некалькіх наступных гадоў пагроза павелічэння колькасці падобных выпадкаў няўхільна расла, і ўжо ў 2002 годзе ў структуры МУС з'явілася самастойнае ўпраўленне, якое ажыццяўляе практычную дзейнасць па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій. Па-іншаму яно называецца «упраўленне «К» ад слова «кібер». Падобныя структуры ўзніклі і ва ўсіх аблвыканкамах, а ў мінулым годзе такі аддзел з'явіўся і пры УУС Мінгарвыканкама.

Як расказаў **намеснік начальніка аддзела па раскрыцці маёмасных злачынстваў ГУУС Мінгарвыканкама Андрэй БУСЛО,** апошнім часам памнохыліся выпадкі вымагання праз інтэрнэт. Усяго ў мінулым годзе ў сталіцы было зарэгістравана 30 выпадкаў здзяйснення гэтага злачынства, 17 з якіх ажыццяўляліся менавіта праз сусветнае павуцінне.

**Перад тым як пераводзіць значную ці не вельмі суму на рахунак свайго знаёмага, варта ўдакладніць у яго ў асабістай гутарцы па тэлефоне, ці сапраўды ўсё так.**

Схема дзеянняў заўсёды адна. Мужчына пачынае зносіны з «дзяўчынай» на сайце знаёмстваў. Пасля непрацяглай перапіскі яна прапануе ўсталяваць відэасувязь праз скайп. Пры гэтым ад размовы голасам дзяўчына адмаўляецца, матывуючы гэта тым, што ў яе нібыта зламаны мікрафон. Паступовая ў перапісцы закранаюцца ўсё больш «гарачыя» тэмы і справа даходзіць да віртуальнай інтымнай блізкасці.

У адзін момант сеанс абрываецца, пасля чаго пачынаюць прыходзіць паведамленні з пагрозамі. Маўляў, усё запісана на відэа, калі не пераведзеш некалькі сотняў долараў на такі электронны кашалёк, разашлю гэты запіс тваім сябрам і блізкім. Злачынцы нават не турбуюць сябе пошукам прыдатнай дзяўчыны: на самой справе мужчына, не падазраючы пра гэта, глядзіць відэазапіс, а зусім не выяву ў рэжыме анлайн, і цалкам магчыма, што пад маскай юнай німфы хаваецца нехта зусім іншы.

Далей ад выбару тактыкі паводзін залежыць не так ужо і шмат. Калі вы не станеце пераводзіць грошы, відэа разашлюць, калі вы перавядзеце грошы, ад вас будуць патрабаваць яшчэ і яшчэ, і калі вы ўсё ж такі адмовіцеся далей спансіраваць злачынцаў, вашы знаёмыя ўсё роўна атрымаюць «цікавы» ліст.

У падобных сітуацыях устанавіць асобу вымагальніка вельмі цяжка, бо дзейнічаюць яны з тэрыторыі іншых краін. Адзінае, што можа вас абараніць у такім выпадку, — уласная асцярожнасць. Не варта давяраць незнаёмым людзям у прынцыпе, а ўжо ў інтэрнэце тым больш: іх намеры далёка не заўсёды чыстыя. А пра абмен асабістымі або кампраметуючымі данымі ўвогуле трэба падумаць дзесяць разоў: ці сапраўды ды аўчынка варта вырабу?

Па словах **старшага ўпаўнаважанага ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій Дзмітрыя СТАСЮЛЕВІЧА,** злачынная думка ніколі не стаіць на месцы, увесь час з'яўляюцца новыя ашуканскія схемы, якія асабліва проста рэалізоўваць праз інтэрнэт. Усе яны пабудаваны на гульні на пачуццях, у той ці іншай ступені ўласцівых усім: сквапнасці, наіўнасці, суперажыванні.

Адна з галоўных прынад, на якіх атрымліваецца злавіць карыстальнікаў інтэрнэту, — гэта прага нажывы. Узрушаючая прапанова: кватэра ці машына, у два разы таннейшыя за рынкавы кошт. Чаму? Гаспадар знаходзіцца за мяжой, і яму трэба тэрмінова прадаць маёмасць. Ёсць толькі адна загваздка: грошай на білет, каб прыляцець аформіць дакументы, у яго зусім няма. Тады шчаслівы будучы, як яму здаецца, уладальнік машыны або кватэры пераводзіць не такую ўжо значную суму задатку і чакае.

Толькі, як кажуць, абяцанага тры гады чакаюць, а ў падобным выпадку можна прачакаць і ўсё жыццё, таму што прадавец не хто іншы як махляр, і ні грошай, ні набытай за іх маёмасці вам ужо не ўбачыць.

Існуе і адваротная схема. Калі вы хочаце здзейсніць буйны продаж праз інтэрнэт, трэба быць вельмі пільным. Напрыклад, вам паступае званок ад патэнцыйнага пакупніка са словамі: «Мы ўлюбіліся ў вашу кватэру, ні ў якім разе не прадавайце (не здавайце) яе нікому іншаму. Каб не паўстала такая спакуса, давайце мы вам унясём задатак на картку». Натуральна, такая прапанова не можа не радаваць, і задаволены гаспадар адпраўляе зламыснікам даныя сваёй карткі, прычым, не маючы доведу, усе, нават тыя, якія павінен ведаць толькі ён. У выніку — замест атрымання жаданага прыбытку чалавек губляе ўсе грошы са свайго асабістага рахунку.

Яшчэ адзін спосаб «стрэсці» з карыстальнікаў інтэрнэту грошы — запусціць на іх камп'ютар шкоднік вірус. Некаторы час назад вельмі нашумелай стала гісторыя, калі беларусам нібыта прыходзілі паведамленні ад МУС ці КДБ такога зместу: ваш камп'ютар заблакіраваны за прагляд на ім дзіцячай парнаграфіі, аплаціце штраф.

**Адзінае, што можа вас абараніць у такім выпадку, — уласная асцярожнасць. Не варта давяраць незнаёмым людзям у прынцыпе, а ўжо ў інтэрнэце тым больш: іх намеры далёка не заўсёды чыстыя.**

І шмат хто палохаўся: а раптам я сапраўды выпадкова штосьці не тое націснуў, тым больш што нічога зрабіць з паведамленнем было нельга, з экрана яно ні пры якіх дзеяннях не знікала. Людзі пераводзілі грошы, іх нават не бянтэжыла, што ў якасці адрасата быў звычайны нумар аднаго з мабільных аператараў. Супрацоўнікі міліцыі нагадваюць, што не выкарыстоўваюць сетку інтэрнэт для апавяшчэння аб якіх-небудзь штрафах, з гэтай мэтай выкарыстоўваецца паштовая сувязь.

Не грэбуюць злачынцы ўзломам асабістых старонак у розных сацыяльных сетках або месенджарах. Калі ад славутасцяў яны хочуць атрымаць фота «не для прэсы» або падрабязнасці перапіскі, то ад шараговых карыстальнікаў ім трэба іншае. Звычайна сябрам карыстальніка пачынаюць прыходзіць паведамленні з просьбай аб тэрміновай грашовай дапамозе, прычым падставы могуць быць разнастайнымі. Перад тым як пераводзіць значную ці не вельмі суму на рахунак свайго знаёмага, варта ўдакладніць у яго ў асабістай гутарцы па тэлефоне, ці сапраўды ўсё так.

Схема, якая выклікае непрыкрытую ўсмешку, — так званыя нігерыйскія лісты. Вы атрымліваеце паведамленне пра тое, што невядомы багаты сваяк пакінуў вам казачную спадчыну або што выпадковым чынам у замежным розыгрышы вы выйгралі вельмі каштоўны прыз. Каб атрымаць усе гэтыя скарбы, трэба зусім няшмат: пераведзіце невялікую суму на афармленне неабходных дакументаў або дастаўку прыза. Пра далейшае развіццё падзей можна і не расказваць...

Сучаснае жыццё дыктуе новыя правілы бяспекі, цяпер асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць не толькі захаванасці маёмасці, але, можа і ў першую чаргу, — абароне асабістай інфармацыі.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

### Абараніць сябе ў інтэрнэце

**1. Не давярайце нікому!** Ананімнасць і прасторавая аддаленасць дазваляюць ашуканцам адчуваць сваю беспакаранасць, а злачынным схемам пастаянна ўдасканальвацца.

**2. Сачыце за кантэнтам.** Чым менш занадта асабістай інфармацыі вы будзеце размяшчаць у сваім профілі, тым лепш. Фатаграфіі юнацкіх забавак могуць стаць кампраметуючымі для супрацоўніка салідной кампаніі, а як можна выкарыстоўваць даныя з фота доўгачаканай візы, зламыснікі прыдумаюць лёгка.

**3.** Перыядычна нагадвайце сабе фразу, знаёмую з дзяцінства: **бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы, але ніяк не ў інтэрнэце.**

**4. Будзьце разважлівыя.** Перад тым як пераводзіць грошы на які-небудзь рахунак, праверце факт існавання такой фірмы, накант правядзення здзелак парайцеся з юрыстам.

**5. Абараніце свой камп'ютар.** Аддавайце перавагу варта ліцэнзійным антывірусным праграмам, якія сапраўды могуць гарантаваць бяспеку.

**6. Абараніце свае акаўнты ў сацсетках.** З узломам акаўнта даводзілася сутыкацца большасці карыстальнікаў, віной гэтага становіцца банальная лянота. Чалавек не хоча турбаваць сябе прыдумваннем і запамінаннем занадта складанага пароля і ў выніку пакутуе ад узлому. Паролі трэба мяняць дастаткова часта (самы надзейны складаецца не менш чым з 12 літар і лічбаў рознага рэгістра), не варта адзін і той жа пароль выкарыстоўваць ва ўсіх сацыяльных сетках, а таксама ні ў якім разе не ўключаць у яго вядомыя асабістыя даныя: прозвішча, імя, дату нараджэння, нумар тэлефона.

**7. Сачыце за блізкімі.** Часта ахвярамі махляроў становяцца самыя ўразлівыя інтэрнэт-карыстальнікі: дзеці і пажылыя людзі. Трымайце пад кантролем іх дзеянні ў сусветнай сетцы.

■ Спаборніцтвы і рэкорды

# ЮНЫЯ АБАРОНЦЫ СЫШЛІСЯ Ў НАПРУЖАНАЙ БАРАЦЬБЕ

## У сталіцы прайшла маштабная спартакіяда



**Сярод удзельнікаў — курсанты кадэцкіх вучылішчаў, спецыялізаваных ліцэяў і Мінскага суворваўскага ваеннага вучылішча. Спартакіяда з такім складам удзельнікаў стала першай у гісторыі і была прымеркавана да 100-годдзя беларускай міліцыі.**



Усяго ў спаборніцтвах прынялі ўдзел амаль 180 прадстаўнікоў кадэцкіх вучылішчаў, а таксама каманда суворваўцаў і ліцэістаў, якія адстойвалі гонар МУС і МНС. Юнакі даказвалі, хто найлепшы ў плаванні, бегу, міні-футболе, стральбе і сілавых практыкаваннях, і дэманстравалі сваё ўменне працаваць у камандзе.

Свае самыя лепшыя якасці і навыкі ўдзельнікі праявілі на працягу трох дзён на базе Акадэміі МУС. «Гарачыя» спаборніцтвы чаргаваліся з пазнавальнымі экскурсіямі. Узнагароджанне пераможцаў адбылося ў зале алімпійскай славы НАК. На цырымоніі прысутнічаў міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Ігар Шуневіч, які адзначыў добрую фізічную падрыхтоўку ўдзельнікаў спартакіяды і іх высокія спартыўныя вынікі. Педагогі і кіраўніцтва вучылішч былі ўдастоены граматамі Міністэрства адукацыі за добрую падрыхтоўку дастойных вучняў.

— Дзякуючы волі да перамогі, напалу спартыўнай барацьбы, непадкупным і шчырым эмоцыям спартакіяда заняла годнае месца ў комплексе ўрачыстых святочных мерапрыемстваў, прымеркаваных да 100-годдзя беларускай міліцыі, — адзначыў кіраўнік міліцэйскага ведамства. — Гэта падзея стала яшчэ адным доказам таго, што ў нашай краіне і Міністэрстве ўнутраных спраў пытанням здаровага ладу жыцця, развіццю спартыўнай інфраструктуры ўдзяляецца, без перабольшання, прыярытэтнае значэнне.

Сярод асноўных мэт правядзення спартакіяды — патрыятычнае выхаванне. Большасць юнакоў, якія вучацца ў спецыялізаваных навучальных установах, у будучыні бачаць сябе афіцэрамі, таму для іх такія спаборніцтвы, вытрыманыя ў духу добрага суперніцтва і дружбы, асабліва важныя.

У агульным заліку першае месца аказалася ў каманды Мінскага суворваўскага вучылішча, другое — у кадэтаў з Брэста, а трэцяе месца — у іх «калег» з Віцебска. Прадстаўнікі ліцэя МУС сёлета занялі чацвёртае месца, аднак, па іх уласным прызнанні, гэта толькі натхніла іх на новыя здзяйсненні ў будучыні ■

■ Памочнікі міліцыі

# Як адказныя кантралёры і пільны падлетак дапамаглі раскрыць злачынствы

## І АТРЫМАЛІ ПАДЗЯКУ АД МІЛІЦЫІ КАСТРЫЧНІЦКАГА РАЁНА г. МІНСКА

**14-гадовы школьнік выпадкова знайшоў 26 кілаграмаў насвая, а дзве жанчыны-кантралёры выявілі больш за 30 выпадкаў падробкі дакументаў.**

Уладзіслаў Несцер сабраўся выйсці пагуляць на двор, калі на агульным балконе заўважыў вялікую сумку. З цікаўнасці малады чалавек вырашыў у яе зазірнуць. Унутры аказалася шмат поліэтыленавых пакетаў з зялёным парашком. Падлетак адразу западозрыў нядобрае, вярнуўся дадому і неадкладна расказаў аб знаходцы бацьку. Той паведаміў пра выпадак у міліцыю.

Супрацоўнікі міліцыі, якія прыбылі на месца здарэння, канфіскавалі сумку. Зялёны парашок аказаўся некурыльнымі тытунёвымі вырабамі, прыдатнымі для жавання альбо смактання, якія ў народзе атрымаў назву насвай. Агульная вага знаходкі — 26 кілаграмаў. У ходзе праверкі было ўстаноўлена, што сумка належала чатыром выхадцам з Гомельскага рэгіёна, якія займаліся рэалізацыяй забароненага рэчыва ў сталіцы.

Кантралёры ДУА «Мінсктранс» Святлана Ажар і Эльвіра Зелянкевіч за год, дзякуючы сваёй назіральнасці, выявілі больш за 30 фактаў падробкі дакументаў, якія даюць права на праезд у грамадскім транспарце. Па выніках праведзеных праверак Кастрычніцкім (г. Мінска) раённым аддзелам Следчага камітэта распачатыя крымінальныя справы па арт. 380 (падробка, выраб, выкарыстанне альбо збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Так, з разліку штодзённага праезду 30 асобамі, якія карыстаюцца падробленымі праязнымі білетамі, толькі на адным відзе транспарту, шкода склала б больш як 12 000 за год.

Як адзначыла сама Святлана Ажар, падробленыя дакументы — гэта галаўны боль для кантралёраў. Як правіла, з падробленымі пасведчаннямі інвалідаў ездзяць пенсіянеры, а студэнты актыўна карыстаюцца «ліпавымі» школьнымі даведкамі. Талончыкі, вядома, ніхто не падрабляе, але некаторыя спрабуюць іх выкарыстоўваць па некалькі разоў. Чаго толькі не робяць «народныя ўмельцы»: прабіўшы талончык, абразаюць электронны надпіс ці выводзяць яго хімічна, на месца, дзе ставіцца штамп, наляпляюць скотч. Але, як ні старайся, усё гэта прыкметна і, галоўнае, — з'яўляецца парушэннем закона! ■

■ Навіны 102

### МІНЧАНІН ВЫКРАЎ КАШАЛЁК З ЧУЖОГА ЗАПЛЕЧНІКА

**Да супрацоўніка міліцыі УУС па ахове Мінскага метрапалітэна на станцыі метро «Міхалова» звярнуўся грамадзянін, які паведаміў, што ў пераходзе гэтай станцыі стаў відавочцам крадзяжу — зламыснік з заплечніка мужчыны, што ішоў наперадзе, выкраў кашалёк.**

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку УУС па ахове Мінскага метрапалітэна, якія прыбылі на месца здарэння, у ходзе разбору хутка ўстанавілі абставіны злачынства, а таксама пацярпелага, які, дарэчы, нават не падазраваў, што ў яго нешта выкралі.

Аператыўнікі прагледзелі запісы камер відэаназірання, на адным з іх выразна было бачна, як зламыснік з заплечніка мужчыны, які ідзе наперадзе па лесвіцы, дастае кашалёк. Атрымаўшы такім чынам прыкметы падазронага, міліцыянеры затрымалі яго каля вуліцы Чыгуначнай. У ходзе асабістага вобыску быў знойдзены выкрадзены кашалёк, аднак без грошай — хлопец ужо паспеў патраціць іх на спіртное.

Зламысніком аказаўся раней судзімы за крадзеж часова непрацуючы 22-гадовы жыхар Мінска. Затрыманы растлумачыў, што злачынства здзейсніў, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення.

### «МАЙСТАР» ЗАЦІКАВІЎСЯ АКУМУЛЯТАРАМІ

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Савецкага РУУС сталіцы затрымалі беспрацоўнага жыхара горада, які ўкраў акумулятары з грузавых аўтамабіляў.**

Апошнія былі прыпаркаваны на вуліцы Багдановіча. Як растлумачылі сведкі, акумулятары выкраў мужчына з каляскай, з якой, на іх думку, перасоўваюцца асобы катэгорыі «бомж». Такія грамадзяне, а таксама супрацоўнікі прыёмных пунктаў, куды мог звярнуцца падазраваны, былі апытаны. У выніку ўстаноўлена, што выкрадальнікам з'яўляецца раней судзімы беспрацоўны жыхар сталіцы па мянушцы Майстар.

Мужчына растлумачыў, што зусім нядаўна ён вызваліўся з ЛПП і прыехаў па месцы жыхарства ў кватэру да бацькоў. Пакуль знаходзіўся ў пошуках працы, заняўся зборам бутэлек і металалому. У чарговы раз, «праходзячы па звыклым маршруце» ў пошуках матэрыялаў, прыдатных да здачы, звярнуў увагу на грузавыя машыны. Агледзеўшы аўтамабілі і выявіўшы элементы, што яго зацікавілі, ён дастаў акумулятары, якія пасля паспрабаваў рэалізаваць. Мужчыну пагражае адказнасць у выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да чатырох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by* ■

■ Экстрым

# У ПАЛОНКУ — ПА ПЕРАМОГУ

## Прадстаўнікі МУС прынялі ўдзел у зімовых заплывах

**Пакуль адны пацепваліся ад холаду ў пухавіках, другія забягалі ў ледзяную ваду на некалькі секунд, трэція... плавалі, прычым, на хуткасць. У сталіцы прайшоў рэспубліканскі фестываль здаровага ладу жыцця «Вадохрышчанскія купанні» ў межах II адкрытага чэмпіянату Беларусі па спартыўным зімовым плаванні «Белгарт Мінск Опэн».**



На Камсамольскім возеры, тэмпература вады ў якім была ўсяго на два градусы вышэй за нуль, сабраліся загартаваныя экстрэмалы не толькі з Беларусі, але Расіі, Эстоніі, Латвіі, Польшчы, Бельгіі, Францыі і Аўстрыі. Усяго больш за 200 спартсменаў.

Тыя, хто не быў упэўнены ў сваіх сілах ці проста хацеў атрымаць задавальненне ад працэсу купання, маглі прыняць удзел у заплывах, дзе не фіксаваўся час. У астатніх жа была магчымасць паказаць свае здольнасці ў заплывах на 25, 50, 100, 200 і 450 метраў рознымі стылямі, а таксама эстафетах.

Выдатна праявілі сябе на чэмпіянаце прадстаўнікі Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС. У склад каманды ўвайшлі падпалкоўнік міліцыі Сяргей Галюк, маёр міліцыі Уладзімір Ярашэвіч і курсанты першапачатковай падрыхтоўкі Ксенія Самарына, Віталь Урбановіч і Аляксей Дорахаў.




У заплывах брасам Ксенія заняла адразу два прызавыя месцы: другое на дыстанцыі 50 метраў і трэцяе на дыстанцыі 25 метраў, усім няшмат ёй не хапіла да перамогі ў 50-метроўцы вольным стылем. Віталь стаў чацвёртым у заплыве на 50 метраў і шостым у заплыве на 25 метраў брасам. Аляксею, як і Ксеніі, удалося паднядца на п'едэстал: ён стаў трэцім у заплыве на 100 метраў вольным стылем, а дыстанцыю 25 метраў брасам завяршыў сёмым. У змяшанай эстафеце вольным стылем каманда цэнтра таксама стала сёмай ■

Адказная за выпуск Дар'я КАСКО. kasko@zviazda.by

# Клуб дае шанц

**У Віцебску для людзей з псіхічнымі захворваннямі створаны спецыяльны клубны дом. 1 лютага — афіцыйнае адкрыццё з удзелам прадстаўнікоў улады. Будуць і цікавыя госці. Напрыклад, чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, які стаў паспяховым прадпрымальнікам. А карэспандэнт «Звязды» атрымаў адтуль запрашэнне стаць валанцёрам.**

## На добрым рахунку...

Клубны дом «Крылы надзеі» функцыянуе на базе Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна г. Віцебска. Гэта ўстанова вядомая тым, што тут укараняюцца перадавыя метады работы і актыўна выкарыстоўваецца найлепшы замежны вопыт.

— Летась на конкурсе «Брэнд года» (па выніках 2015-га) цэнтр быў удастоены бронзавага медаля ў намінацыі «Актыўная сацыяльная пазіцыя». На тым жа конкурсе дыпломам фіналіста была адзначана дзейнасць у прафесійнай намінацыі «Навука і адукацыя» — за стварэнне «Народнага сацыяльнага ўніверсітэта», — расказвае **намеснік дырэктара Анатоль МІХАЙЛАЎ.**

Установа з'яўляецца яшчэ і вучэбным навукова-кансультацыйным цэнтрам. Тут праводзяцца лекцыі, семінары, «круглыя сталы», сустрэчы ў незвычайных фарматах: «Open Space» і «Сусветнае



Дырэктар клубнага дома Алена БАРЫЛА.

кафэ». Паспяхова рэалізуецца праект «Танцы на калясках».

Цэнтр — «лабараторыя» для навуковых даследаванняў. Тут вядзецца навукова-інавацыйная работа, рыхтуюцца даследчыя праекты. Студэнты Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава праходзяць у цэнтры практыку, пішуць дыпломныя работы... Былы міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна Шчоткіна не раз давала высокую ацэнку дзейнасці супрацоўнікаў гэтай установы і валанцёраў.

Цяпер тут укараняецца чарговы кірунак дзейнасці.

— Мы маем гонар першымі ў вобласці распачаць новую форму работы з жыхарамі не толькі нашага раёна, але і ўсяго горада. Трэба стварыць аптымальныя ўмовы, каб людзі з псіхічнымі расстройствамі адчувалі ўвагу да сябе не толькі з боку медыкаў. Каб маглі знайсці месца ў грамадстве, — каментуе **намеснік кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна Віцебска Вольга ГУРЧАНКА.**

## Як на Захадзе

Клубны дом — сацыяльная служба для людзей з псіхічнымі захворваннямі. Асноўная мэта — дапамагчы ім жыць паўнавартасным жыццём. Сотні падобных «клубаў» дзейнічаюць прыкладна ў 40 краінах. І штогод ствараюцца дзясяткі новых.

А першы з'явіўся ў 1948-м у Нью-Ёрку. Людзі, якія лячыліся ў псіхіятрычнай клініцы, аб'ядналіся для стварэння групы самадапамогі. Яе назва з англійскай перакладаецца як «Мы не адзінокія». З часам група стала інавацыйнай супольнасцю. Праз некалькі гадоў валанцёры дапамаглі ёй купіць будынак. Арганізацыю перайменавалі ў «Фантан Хаус». Кіраўнік атрымаў грант ад Нацыянальнага інстытута псіхічнага здароўя ЗША — на распрацоўку трэнінгавай праграмы, каб распаўсюджваць вопыт...

«Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў» выявіла, што выдаткі на работу двух супрацоўнікаў клубнага дома, якім дапамагаюць валанцёры, роўныя месячнаму знаходжанню пацыента ў стацыянары. А ў 60% тых, хто наведвае клубы, працягласць лячэння скарачаецца на трэць. Такім чынам, можна сэканоміць бюджэтныя сродкі.

У Беларусі клубныя дамы створаны ў сталіцы (у 2011-м), пазалетась — у Брэсце. А пасля віцяблян плануюць працягнуць эстафету гродзенцы.

Праект рэалізуецца Беларускай асацыяцыяй сацыяльных работнікаў у супрацоўніцтве з Парытэтным сацыяльным псіхіятрычным цэнтрам і клубным домам «Ластаўчына гняздо» (Мюнхен) пры падтрымцы нямецкага фонду «Акцыя — Чалавек».



Майстар-класы.

## Вучацца і вучаць...

Клубны дом афіцыйна справіць наваселле ў канцы студзеня — у некалькіх пакоях былога прытулку для непаўналетніх. Пакуль што члены клуба збіраюцца ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання.

— Працуем штодня, акрамя выхадных. Можам сабрацца і на святы. У штаце я і сацыяльны работнік. Дапамагаюць валанцёры, якіх усё больш. У тым ліку гэта і псіхічна нездаровыя людзі. Сярод тых, для каго створаны клуб, людзі розных узростаў. І нямала вельмі адораных. Напрыклад, хлопец Барыс захапляецца камп'ютарамі і пажадаў вучыць камп'ютарнай грамаце, весці клубную старонку ў інтэрнэце. 32-гадовы Іван — чалавек з «залатымі рукамі». Сказаў, што гатовы нешта рамантаваць, мэблю збіраць. Прызнаўся, што не хочa тупець ля тэлевізара без працы. Ігару за 40 гадоў, у яго дзве вышэйшыя адукацыі. Ганна «на хаду» прыдумвае вершы, — тлумачыць **дырэктар віцебскага клубнага дома «Крылы надзеі» Алена БАРЫЛА.**

Для членаў клуба арганізуюць экскурсіі, наведванні тэатраў, майстар-класы. Напрыклад, вучыліся рабіць ёлкі з цеста, 3D паштоўкі. Вучацца кухарыць, выступаць у нумарах мастацкай самадзейнасці.

Важна, што клубны дом дапамагае знайсці працу. На старонцы на сацыяльным рэсурсе ёсць інфармацыя пра вакансіі. У прыватнасці, шукалі маляра вырабаў з дрэва з зарплатай 350 рублёў. Гэта вакансія і для тых, хто гатовы стаць вучнем. Столькі ж прапаноўвалі кур'еру, сартавальніку драўнінных матэрыялаў і вырабаў з дрэва. А на 50 рублёў больш — рамшчыку.

— Асаблівасць нашай дзейнасці ў тым, што нас не цікавіць дыягназ, мы не патрабуем даведак з дыспансера. Вы таксама можаце ўступіць у клуб. Чаму б не весці курс па азах журналістыкі? Цікавіцеся псіхалогіяй? Раскажыце і пра гэта, — прапанавала дырэктар.

У планах дабрачынныя акцыі для збору грошай на патрэбы клубнага дома. Яго члены зоймуцца і прапагандай таго, што людзі з праблемамі псіхікі могуць прыносіць карысць грамадству. Яны маюць права не быць чужымі і абузай, атрымаць шанц рэалізаваць сябе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# КАМУ ПЛАЦІЦЬ ЗА ЗЛІТЫЯ ЛІТРЫ?



***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

**Начальнік упраўлення ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама Сяргей ВАШКЕВІЧ** патлумачыў тэхнічны бок праблемы:

— Неабходна ставіць спускавы клапан, але пры той сістэме разводкі, якая існуе ў доме, узнікае вялікая верагоднасць затаплення. Да таго ж, як паведамілі спецыялісты праектнага інстытута, гэта не гарантуе, што з крана адразу ж пабяжыць вада 50-градуснай тэмпературы. У любым доме і на любым паверсе прыходзіцца зліваць ваду па 3-4 секунды, пакольκі адгалінаванне ад стаяка з гарачай вадой да крана астывае.

Дарэчы, дамоў з такой жа сістэмай гарачага водазабеспячэння, як у заяўніка, у Магілёве 320.

— Злію вады там складае ад 2 да 7 секунд пры сярэднім выдатку 100—150 грамаў у секунду, — паведаміў намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Аляксандр Вяракса. — Канешне, калі памножыць 100 грамаў на 100 адкрыццяў крана, лічба будзе больш сур'ёзнай. Але пакуль толькі адзін жыхар узняў такое пытанне.

Карэспандэнт «Звязды» таксама спыталася ў намесніка міністра, ці магчыма для жыхароў апошніх паверхаў, дзе адбываецца такія нязручнасці, прадставіць 10-працэнтную зніжку, як і для тых, хто жыве ў дамах з адсутнасцю сістэм рэцыркуляцыі.

— Тут не можа быць ніякага параўнання, — адказаў ён. — У тых дамах, дзе няма сістэмы рэцыркуляцыі, сапраўды прыходзіцца зліваць шмат вады. Гэта даказаны факт. І там людзі не карыстаюцца тым пабочным цяплом, якое ідзе ад змеевікоў. Там у ванных пакоях холадна. Але такія тэхнічныя рашэнні існавалі ў Савецкім Саюзе. І перарабляць іх дорага. Ёсць, вядома, тэхналогіі, калі праз паўсекунды ідзе гарачая вада. Напрыклад, праточны воданагравальнік. Але ён бярэ вельмі шмат электраэнергіі. Можна паставіць такі прыбор, але прыйдзецца больш плаціць за электраэнергію.

— А чаму б не задзейнічаць прыборы ўліку, якія лічаць толькі гарачую ваду?

— Прыборы ўліку, незалежна ад таго, халодная гэта вада або гарачая, тэмпературу не ўлічваюць. Падагрэў ідзе ў групавым або індывідуальным бойлеры. Цяпло награвае халодную ваду, і яна ідзе ў кран. Калі не захоўваецца цеплавы стандарт, ёсць механізм перараліку. Але калі вада на нейкім этапе набірае 50 градусаў, пераразліку не будзе.

## ПРА КАПРАМОНТЫ, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ЛІЧЫЛЬНІКІ І СУМЛЕННЕ

Сяргей Вашкевіч паведаміў, што за год у адрас жыллёва-камунальных прадпрыемстваў паступіла больш за 9 тысяч зваротаў. Людзей хвалявалі пытанні эксплуатацыі і абслугоўвання жыллёвага фонду, добраўпарадкавання тэрыторыі і разлікаў за камунальныя паслугі. Апошнія, запэўніў кіраўнік абласнога ведамства ЖКГ, на 80% былі знятыя, дзякуючы тлумачэнням.

Адна з надзённых тэм, якая турбуе насельніцтва, — правядзенне капрамонтаў. За апошнія некалькі гадоў іх колькасць у вобласці і краіне ў цэлым павялічылася больш чым удвая. І, як паведаміў намеснік міністра ЖКГ, у наступныя гады будзе яшчэ павялічана да 3% ад агульнага жыллёвага фонду. Гэта прадугледжана зацверджанай урадам Беларусі на 2016—2020 гады праграмай «Камфортнае жыллё». Дарэчы, Магілёўшчына першая ў рэйтынгу краіны па якасці і тэрмінах правядзення капрамонтаў. Для параўнання, летась ад насельніцтва вобласці паступіла 152 звароты на гэтую тэму, а, напрыклад, у Мінскай — 1274.

**«Злію вады там складае ад 2 да 7 секунд пры сярэднім выдатку 100—150 грамаў у секунду. Канешне, калі памножыць 100 грамаў на 100 адкрыццяў крана, лічба будзе больш сур'ёзнай. Але пакуль толькі адзін жыхар узняў такое пытанне».**

Жыхары таксама заклапочаны пытаннем эканоміі цяпла. Некаторыя скардзяцца, што ў кватэрах бывае так горача, што прыходзіцца адчыняць форткі. Крыўдна, што за гэтыя лішкі прыходзіцца плаціць са сваёй кішэні. Генадзь Трубіла паведаміў, што ў краіне створана працоўная група, якая якраз і займаецца пытаннямі паступовага пераходу на індывідуальныя прыборы ўліку цяпла. «З 2010 года ў Беларусі будуюцца жылыя дамы з гарызантальнай разводкай ацяплення і індывідуальнымі прыборамі ўліку цяпла. Іх пакуль у агульнай масе мала. У дамах старой жылой забудовы праправоўваем магчымасць устаноўкі размеркавальнікаў цяпла з сістэмай рэгулявання на вертыкальная разводкі ацяплення. Паколькі праблема эканоміі цяпла не толькі дзяржаўная, але і кожнага грамадзяніна паасобку, збіраемся ўцягнуць у гэтую справу жыхароў. За іх кошт, напрыклад, будзе набывацца прыбор і рэгулятар, а ўстаноўка — за бюджэтныя сродкі. На 96% жыллё ў краіне прыватызаванае. Людзі могуць і павінны ўплываць на цеплаcпажыванне ў сваіх кватэрах. Гэта ў іх жа інтарэсах. Мы праводзілі ў Мінску маніторынг, падчас якога ўстанавілі, што, калі кожны пачне памяншаць цяпло ў сваёй кватэры, то эканомія ў цэлым па доме складзе каля 10%.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

■ Грамадскі актыў

# ЗМЕНЫ МАГЧЫМЫЯ

## Пытанне пераўтварэння ў партыю з парадку дня не здымаецца

**Пра гэта заявіў старшыня «Белай Русі» Аляксандр РАДЗЬКОЎ на пасяджэнні Рэспубліканскага савета аб'яднання.**



«Мы не змагаемся за ўладу, мы супрацоўнічаем з ёй. Наша мэта вызначана кіраўніком дзяржавы: разам за моцную і квітнеючую Беларусь. І «Белая Русь» выступае ў якасці грамадскай апоры ўлады на шляху да дасягнення гэтай мэты. Такая адна з прычын, чаму мы да гэтага часу не прынялі рашэння аб пераўтварэнні ў партыю, хоць мы ў гэтым кірунку вельмі грунтоўна працуем», — патлумачыў Аляксандр Радзькоў.

Паводле слоў старшыні аб'яднання, «Белая Русь» выступае ў якасці канкурэнта тых палітычных груп, якія прэтэндуюць на ўладу, і менавіта таму пытанне пераўтварэння ў партыю з парадку дня не здымаецца, а разглядаецца кіраўніцтвам як адзін з этапаў эвалюцыйнага развіцця арганізацыі.

Рэспубліканскі савет падчас пасяджэння вызначыў, што трэці з'езд «Белай Русі» пройдзе 28 кастрычніка. Месцам правядзення ўдзельнікі савета аб'яднання аднагалосна зацвердзілі Палац Рэспублікі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■

■ Экалагічны лікбез

# ЛЕС ПАТРАБУЕ ЗАКОНАПАСЛУХМЯНАСЦІ

**Якія парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства цягне за сабой самагонаварэнне ў лесе? Шрот, карцеч, куля: у чым адрозненні? Наколькі сур'ёзнай можа быць адказнасць за здабычу звяроў, якія не з'яўляюцца паляўнічымі, у тым ліку ўключаных у Чырвоную кнігу нашай краіны? На гэтыя пытанні сёння даюць адказы спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

## Самагон супраць экалогіі

**...Ледзьве прыкметны дымок над полагам лесу і адсутнасць гукаў лесанарыхтоўчай тэхнікі навялі работнікаў Ваўкавыскай міжрайінспекцыі на думку пра незаконную вытворчасць самагону ў глухім гушчары Падароскага лясніцтва. Інтуіцыя не падвяла — у лесе дзяржінспектары выявілі ўнушальных памераў самагонны апарат і больш за шэсць тысяч літраў гатовай да перагону брагі.**



Навокал было раскідана бытавое смецце, ссечана некалькі вялікіх сосен і цалкам знішчана жывое надглебавае покрыва на плошчы каля 50 квадратных метраў. Самагоншчыкаў на месцы не аказалася, таму было прынята рашэнне арганізаваць схаванае назіранне, для чаго дзяржінспектары выклікалі супрацоўнікаў мясцовага РАУС. У той жа дзень быў затрыманы 25-гадовы жыхар вёскі Поразава Свіслацкага раёна.

За знішчэнне надглебавага покрыва, незаконную высечку дрэў і забруджванне лесу ў адносінах да затрыманага склалі пратаколы па трох артыкулах Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь. Міліцыя прыцягнула вяскоўца да адказнасці за самагонаварэнне. А на наступны дзень работнікі гэтай жа міжрайінспекцыі выкрылі чарговага самагоншчыка ў лесе каля вёскі Варонічы Свіслацкага раёна. У выніку зліву гарачых фракцый прадукцыі самагонаварэння ён знішчыў жывы надглебавы покрыў на плошчы 30 квадратных метраў, засмеціў лес. У парушальніка канфіскавалі 600 літраў брагі.

Самагонаварэнне ў лесе цягне шматлікія парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства. Гэта і высечка драўнінна-хмызняковай расліннасці (для распальвання вогнішча), і засмечванне прылеглай тэрыторыі, і — што таксама мае значэнне — знішчэнне жывога надглебавага покрыва і ляснога подсцілу злівамі гарачых таксічных адходаў вытворчасці самагону.

## «СПАДАРОЖНІК» СХІЛЬНЫ ДА РЫКАШЭТУ

**Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання (дадатак 2) рэгламентуюць, якія прылады і боепрыпасы трэба выкарыстоўваць пры паляванні на розных жывёл. Прымяненне недазволеных боепрыпасаў небяспечнае сур'ёзнымі наступствамі для паляўнічага і можа быць кваліфікавана як незаконнае паляванне.**

Пункт 114 Правілаў забараняе не толькі выкарыстанне, але і нашэнне ў паляўнічых угоддзях патронаў, забяспечаных кулямі або карцеччу, пры паляванні на ненармаваныя віды (большасць пушных і птушак), пакідаючы ў арсенале такіх паляўнічых толькі шрот. У сваю чаргу, прымяненне карцечы, не кажучы ўжо пра шрот, недапушчальна пры паляванні на буйных капытных — ласа, аленя, дараслага дзіка.

Улічваючы гэтыя патрабаванні, паляўнічым неабходна дакладна адрозніваць адзін ад аднаго кідальныя элементы патронаў — шрот, карцеч, кулю.

Правіламі вызначана, што шрот — гэта металічныя шарыкі або элементы іншай формы дыяметрам (памерам) да 5 міліметраў уключна, якія выкарыстоўваюцца для падрыхтоўкі паляўнічых патронаў. Згодна з прынятай яшчэ ў СССР нумарацыяй, шрот дыяметрам 5 міліметраў адпавядае максімальнаму па памеры нумару — 0000. Кожны наступны нумар адрозніваецца ад папярэдняга на 0,25 міліметра.

Найбольшай папулярнасцю карыстаецца шрот ад №0000 да №8. Паляўнічыя на бакаса і перапёлку часцяком выкарыстоўваюць патроны са шротам №9 або №10. Больш дробныя нумары не атрымалі шырокага скарыстання.

**Кожны паляўнічы павінен мець дакладнае ўяўленне аб адметных прыкметах паляўнічых жывёл і тых, якія да такіх не адносяцца, ведаць віды, занесеныя ў Чырвоную кнігу.**

У адпаведнасці з Правіламі карцеч — гэта металічныя шарыкі або элементы іншай формы дыяметрам (памерам) больш за 5 міліметраў, якія выкарыстоўваюцца для падрыхтоўкі паляўнічых патронаў. Найбольш ходавымі памерамі карцечы з'яўляюцца — 6,2; 6,5; 7,15; 7,55; 8,0; 8,5; 9,0 міліметраў. Папулярныя сярод паляўнічых і патроны, падрыхтаваныя карцеччу «Трыа», — тры буйныя карцечыны (11,5 міліметра), змешчаныя ў спецыяльны кантэйнер. Нярэдка паляўнічымі выкарыстоўваецца для падрыхтоўкі патронаў звязаная карцеч, што значна павышае кучнасць стральбы і не забаронена заканадаўствам.

У Правілах палявання адсутнічае азначэнне паняцця «куля». Разам з тым, у адпаведнасці з ДАСТ 28653-90 «Зброя стралковая. Тэрміны і азначэнні», куля патрона стралковай зброі — кідальны элемент, які выкідаецца з канала ствала стралковай зброі такім чынам, што праз папярочнае сячэнне канала ствала ў кожны момант праходзіць толькі адзін такі элемент.

Існуе мноства розных відаў і тыпаў куль да гладкаствольнай паляўнічай зброі. Аднак звяртаем асаблівую ўвагу, што пры правядзенні загонных паляванняў выкарыстанне патронаў да гладкаствольнай зброі з круглай куляй («Спадарожнік» і інш.) забаронена з-за яе схільнасці да рыкашэту.

Некалькі слоў пра кулі для гладкаствольнай паляўнічай зброі. Патроны «Комбі» (куля + карцеч), а таксама патроны тыпу «Тандэм», падрыхтаваныя двума сталёвымі шарыкамі вялікага дыяметру, расцэньваюцца як падрыхтаваныя карцеччу. Выкарыстоўваць іх для здабычы буйных капытных (ласа, аленя, дараслага дзіка) нельга.

**Самагонаварэнне ў лесе цягне шматлікія парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства. Гэта і высечка драўнінна-хмызняковай расліннасці, і засмечванне прылеглай тэрыторыі, і знішчэнне жывога надглебавага покрыва і ляснога подсцілу.**

Пры падрыхтоўцы да чарговага выезду на прыроду паляўнічаму будзе не лішнім уважліва агледзець свой патранташ і праверыць, ці адпавядаюць патроны, якія знаходзяцца ў ім, правілам маючага адбыцца палявання.

Нашэнне і (або) выкарыстанне забароненых прылад палявання (у тым ліку патронаў да паляўнічай зброі) цягне адміністрацыйную адказнасць у адпаведнасці з часткай 1 артыкула 15.37 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь у выглядзе накладання штрафу (ад 20 да 50 базавых велічынь) з канфіскацыяй або без канфіскацыі прылад палявання і з пазбаўленнем спецыяльнага права.

## Якая цана ў «чырванакніжніка»?

**У ходзе палявання на пушных паляўнічых жывёл заўсёды ёсць верагоднасць сустрэць звяроў, якія не з'яўляюцца паляўнічымі, у тым ліку ўключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Нават ненаўмысная іх здабыча пагражае сур'ёзнымі наступствамі і можа надоўга пазбавіць паляўнічага магчымасці займацца любімай справай.**

У лістападзе мінулага года аператыўнікі Дзяржінспекцыі непадалёк ад вёскі Шыкуці Валожынскага раёна затрымалі 26-гадовага мінчаніна, які ў працэсе палявання на пушніну незаконна здабыў чырванакніжнага гарнастая. Нанесеная прыродзе шкода склала 210 базавых велічынь або 37,8 мільёна (недэнамінаваных) рублёў. Гэтую буйную суму і давялося выплаціць паляўнічаму за дробнага, але каштоўнага звярка.

Каб пазбегнуць падобных сітуацый, кожны паляўнічы павінен мець дакладнае ўяўленне аб адметных прыкметах паляўнічых жывёл і тых, якія да такіх не адносяцца, ведаць віды, занесеныя ў Чырвоную кнігу.

Незаконнае паляванне, у тым ліку здабыча ў працэсе палявання дзікай жывёлы, не аднесенай да паляўнічай, або паляўнічай жывёлы, не ўказанай у паляўнічай пуцёўцы (апрача ваўка, лісіцы, янотападобнага сабакі, вароны шэрай і сарокі), цягне адміністрацыйную (штраф ад 20 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй, або без канфіскацыі прылад палявання і з пазбаўленнем спецыяльнага права), крымінальную (штраф, пазбаўленне волі на тэрмін да шасці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю) і грамадзянска-прававую (пакрыццё шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю) адказнасць.



У выпадку незаконнай здабычы дзікай жывёліны, якая з'яўляецца ўзорам CITES або ўключанай у Чырвоную кнігу, памер шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю, вылічаецца ў двайным або трайным памерах адпаведна. Пры незаконнай здабычы дзікай жывёліны, якая жыве ва ўгоддзях, у якіх забаронена яе адабранне, памер шкоды вылічаецца ў трайным памеры.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

■ На слыху

## УХІЛЯЛІСЯ І АДМЫВАЛІ

### У Магілёве затрымана злачынная група, якая існавала за кошт дзяржавы

**Ухіленне ад выплаты падаткаў, «адмыванне» грошай, крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі і пры дапамозе камп'ютарнай тэхнікі, выманьванне крэдытаў і субсідый — цэлы букет злачынстваў, у якіх абвінавачваюцца адразу некалькі «шэрых» бізнесменаў.**

— Арганізаваная злачынная група з пяці чалавек дзейнічала два з паловай гады — з 2013 па красавік 2015, — паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН.** — Яе арганізатарам і натхняльнікам быў 30-гадовы магілявчанін. Шкода, якую гэтыя людзі прычынілі дзяржаве, складае 3,6 мільёна дэнамінаваных рублёў.

Членамі групы былі заснаваны альбо ўцягнуты ў злачынную дзейнасць шэраг камерцыйных прадпрыемстваў Магілёва — завод тэхнічных канструкцый «ТКБел», «Люкс дах», «Белпрампласт», «ТКМГандаль», «Смарткомпані», «Р.Т.С.-Фінанс». Усе яны выкарыстоўваліся для атрымання наяўных фінансавых сродкаў. Грошы потым легалізаваліся і прысвойваліся членамі групы.

Для незаконнага атрымання банкаўскіх крэдытаў стваралася бачнасць фінансавага дабрабыту ўзначаленых і падкантрольных арганізацый. Наяўныя грошы здымаліся членамі злачыннай групы шляхам заключэння фіктыўных дамоў на аказанне рознага роду паслуг. Непагашаная запазычанасць па атрыманых крэдытах склала больш за 500 тысяч долараў ЗША.

Усталяваны факты паставак праз падкантрольныя фірмы з Расіі на адрас беларускіх перапрацоўчых прадпрыемстваў больш таннай сыравіны пад выглядам сухога абястлушчанага малака. Для легалізацыі тавару ў вытворчых памяшканнях адной з падкантрольных фірмаў рабілася замена цэтлікаў.

Злачынцы дзейнічалі па падложных першасных уліковых дакументах, якія праводзіліся праз бухгалтэрыю ўдзельнікаў здзелак. Падчас папярэдняга следства доказана 27 эпізодаў злачыннай дзейнасці, сума кампенсаванага ўрону склала 100 тысяч дэнамінаваных рублёў.

— Абвінавачаныя нясуць адказнасць адразу па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік УСК па Магілёўскай вобласці Акса на САЛЯНЮК.** — Крымінальная справа, аб'ём матэрыялаў якой складае 124 тамы, перададзена пракурору для накіравання ў суд. Чатыры ўдзельнікі злачыннай групы знаходзяцца пад вартай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
zigulya@zviazda.by

# ПЛАЦІНАВЫЯ ДАТЫ ГІСТОРЫІ



Аляксей Фралоў, Ірына Аўдзеева, Сяргей Махаў — ансамбль салістаў «Вытокі» ў Падуанскім універсітэце ля мемарыяльнай дошкі Францыску Скарыну.

## «ГЕРОЙ УСІХ ЧАСОЎ»

Францыск Скарына — герой усіх часоў нашага народа. Сэнсам свайго жыцця і дзейнасці ён бачыў тое, каб даць нашаму народу Біблію на роднай мове. Гэта каласальны ўчынак — чацвёртая Біблія ў свеце, надрукаваная на нацыянальнай мове, пасля чэшскай, нямецкай і італьянскай. Для гісторыі сусветнай цывілізацыі — фенаменальная з'ява: можна сказаць, што беларусы — наперадзе планеты ўсёй. Гэта сведчыць пра спеласць грамадства таго часу, патрэбу ў ведах. Сведчыць пра скарынаўскую мудрасць і гатоўнасць да такой працы, пра кемлівасць — па ўсіх параметрах ён падрыхтаваўся і зрабіў. У той час у заходніх краінах Біблія была на лацінскай мове, ва ўсходніх — на старабалгарскай, або царкоўнаславянскай. А данесці яе на мове народа — гэта сапраўды рэфармацыйны ўчынак. Таму прадстаўнікі розных цэркваў таго часу нават называлі яго «гусітам» і абвінавачвалі ў тым, што ён паддаўся ўплыву няправільных поглядаў. Сёння мы разумеем, наколькі смехатворнымі былі гэтыя закіды, але ў той час яны ўспрымаліся сур'ёзна. Усе мы ведаем, як Скарына ездзіў у Маскоўскае княства і спрабаваў там папулярызаваць Біблію на нашай, больш зразумелай ім (чым старабалгарская) мове. Але адтуль яму давялося ўцякаць.

## «НА 8 ГАДОЎ РАНЕЙ ЗА ВЫДАННЕ ПА-АНГЛІЙСКУ»

Мы павінны разумець, што сёлета адзначаем не толькі юбілей Скарыны, але і 500-годдзе перакладу Біблії на блізкую нашаму народу мову. Хоць да старабеларускай мовы ён яшчэ толькі набліжаўся і не ўвасобіў яе так, як тыя, хто пісаў Статуты ВКЛ. Але што каштоўна, ён аздобіў біблейскія тэксты сваімі назіраннямі, разважаннямі, філасофскімі ідэямі. І гэта таксама рэфармацыйны крок — пачаць дыскусію з нагоды Святога Пісання. Гэта было новым дыханнем у хрысціянскай думцы. Супрацоўнік Брытанскага і Заможнага Біблейскага таварыства Уілфрыд Уайзман яшчэ ў 1928 годзе напісаў: «Беларусы — адзін з першых народаў, які надрукаваў Пісанне на сваёй мове. Гэта было ў 1517 годзе, на 8 гадоў раней за першае друкаванае выданне па-англійску. Можна ўявіць, якімі б былі цяпер беларусы, калі б пераслед і ўціск веры ў канцы XVI стагоддзя не прывялі народ да заняпаду».

## «МУЗЫКА, ЯКАЯ ПІСАЛАСЯ НА НАШАЙ ЗЯМЛІ»

Скарына і музыка — што ў іх агульнага?.. Гэтым пытаннем задаваліся на працягу многіх дзясяткаў гадоў. Амаль да канца савецкай эпохі нам імкнуліся давесці праз падручнікі, што гісторыя беларускай прафесійнай музыкі пачалася з 1917 года, дзякуючы ўказам Леніна і Луначарскага «Аб заснаванні музычных арганізацый». Дасведчаныя людзі здзіўляліся, як жа так?.. Ёсць беларуская архітэктура, літаратура, жывапіс, якія маюць даўнюю гісторыю, ёсць постаць Скарыны, але няўжо ніхто нічога не іграў і не спяваў, няўжо такая маўклівая нацыя была?.. Гэта непаразуменне працягвалася да таго часу, пакуль не знайшлося некалькі чалавек, што пачалі прадзірацца скрозь завалы хлусні. Высветлілася, што, вядома ж, было! Натуральна, гэта спадчына пацярпела матэрыяльна — нотныя творы з эпох Рэнесансу, Барока, нават Класіцызму мала захаваліся, іх парасцягвалі па бібліятэках, па архівах замежжа. А тое, што было апублікавана, было «зацёрта» як наша — яму прысвоілі іншыя геаграфічныя параметры. Але калі разабраліся, то высветлілася, што гэта музыка, якая пісалася на нашай зямлі, пісалася для яе, кампазітарамі мясцовага паходжання. Дазволена было паказваць толькі фальклор — бо гэта народнае і дэманстравала сацыяльны клас. Аднак у выніку працы над беларускай Атлантыдай адкрылася музыка розных класаў, эпох, усплыла музыка арыстакратычная, духоўная, прычым розных канфесій.

## «БІБЛІЯ — ГЭТА ФУНДАМЕНТ, КАНСТРУКЦЫЯ, ШПІЛЬ І КРЫЖ НА ІМ»

Музычнае святкаванне распачнецца канцэртам у Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Аднак у нас будзе не адзін канцэрт, а цэлы цыкл — з салістамі ансамбля «Вытокі», капэлы «Акадэмія», дзяржаўным камерным хорам. Да праекта далучацца Нацыянальны мастацкі музей, Мірскі замак, якія дадуць свае пляцоўкі. Мы будзем асвятляць розныя старонкі музычнай спадчыны, так ці інакш звязаныя са Скарынам. А ў першай праграме разгледзім уплыў Біблії на музычную культуру і культуру ў цэлым. Для эпохі Рэнесансу і Барока Біблія — гэта і фундамент, і канструкцыя, і шпіль, і крыж на ім. Музыка напаўняла гэту структуру, ідэяй якой была папулярызацыя Святога Пісання. З гэтымі пазіцыямі сінхранізуецца Рэфармацыя, распачатая Марцінам Лютэрам. Наш першы канцэрт прысвечаны дзейнасці Скарыны і Лютэра, якія ішлі паралельна. У музыцы можна будзе пачуць, што было перадумовай думак першадрукара. Упершыню будзе пастаўлены харал Яна Гуса, які быў напісаны за 100 гадоў да выхаду першай кнігі Скарыны. Прагучыць харал самога Марціна Лютэра, які, як вядома, быў таленавітым у многім, у тым ліку ў музыцы. Прагучаць беларускія творы XVI стагоддзя. Будуць выкананы і сапраўдныя шэдэўры, якія маркіруюць эпоху, — Баха і Гендэля.

## «ШТО ІГРАЛІ ТРУБАЧЫ НА ЗАМКАВАЙ ВЕЖЫ...»

— Скарына, пэўна ж, чуў музыку на базарных плошчах у Полацку, Вільні, пазней у Кракаве, Празе, італьянскіх гарадах. Думаю, ён кантактаваў з музыкамі — мог падысці, даць манету, аддзячыць за музіцыраванне — па яго партрэце і ўчынках ён уяўляецца мне добрым чалавекам. Мог чуць музыку на прыёме ў вялікага князя літоўскага, рускага і жамойцкага, а па сумяшчальніцтве караля польскага Жыгімонта Старога, які выпісаў яму ахоўную грамату ва ўсе краіны свету. Гэта была не проста «шэнгенская віза» ў сучасным разуменні, а ліст, які сведчыў, што гэта вялікі муж, якога трэба шанаваць і спрыяць яму па загадзе самога князя і караля. Ён, пэўна ж, чуў высокую прыдворную музыку і на прыёмах у Вільні, Кракаве. Слухаў, што ігралі трубачы на замкавай вежы, вітаючы князя, які заязджаў у горад... Аскепкаў той музычнай культуры Беларусі каля 200 — і яны зафіксаваны ў «Полацкім сшытку».

## «ПІК РОСКВІТУ НАШАГА НАРОДА»

Эпоха Скарыны — гэта «залаты век» нашай гісторыі. Нягледзячы на ваенныя дзеянні, якія здараліся час ад часу, магутнасць нашых продкаў і іх дзяржаў была надзвычайнай. У наступныя эпохі будзе больш хваравітасці, спрэчак, унутраных канфліктаў... Але тут — пік росквіту нашага народа. Мы павінны з удзячнасцю ўшаноўваць гэтыя даты — яны плацінавыя. 500-годдзе больш не паўторыцца ніколі. Каб не было тых людзей і іх учынкаў, не было б, па сутнасці, еўрапейскай цывілізацыі, у тым ліку нашай дзяржавы, нацыянальнага самаўсведамлення. Мы б не ведалі «кім звацца?», «а хто там ідзе?» — і адказаў на іншыя сакрамэнтальныя пытанні. Дзякуючы Скарыну наш народ быў выведзены на вяршыню культурнага прагрэсу.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Запрашальнік

# УБАЧЫЦЬ ПРАЦУ РЭСТАЎРАТАРАЎ

**Сёння ў Нацыянальным гістарычным музеі адбудзецца прэзентацыя вынікаў рэстаўрацыі рэдкага музейнага прадмета XVIII — пачатку XIX стагоддзя — арната, які служыў адзеннем каталіцкаму святару. Гэта стала магчымым дзякуючы гранту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у навуцы, адукацыі, ахове здароўя, культуры.**

Унікальнасць арната ў тым, што ён дэкараваны шматлікімі ўстаўкамі з некалькіх відаў слуцкіх паясоў. Але яго стан выклікаў нямала пытанняў у музейных спецыялістаў: шматлікія пашкоджанні і страты тканіны, забруджанні... Напачатку здавалася, вярнуць жыццё гэтаму каштоўнаму помніку ўжо не ўдасца.

Атрымальнік гранта, які дазволіў правесці гэтую карпатлівую работу, **рэстаўратар Нацыянальнага гістарычнага музея Вольга КАНАПЛЁВА** расказала:

— Вопыт рэстаўрацыі гэтых помнікаў беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва XVIII — XIX стагоддзяў сведчыць пра тое, што ў кожным асобным выпадку яна ажыццяўляецца па індывідуальнай тэхналогіі. У айчыннай музейнай практыцы апісанні альбо абагульненні працэсаў рэстаўрацыі слуцкіх паясоў і арнатаў з іх фрагментамі не праводзіліся. Таму я прыняла рашэнне пайсці па шляху мінімальнага ўмяшання ў матэрыяльную структуру музейнага прадмета.

Да працы рэстаўратар прыступіла толькі пасля праходжання стажыроўкі ў Цэнтры рэстаўрацыі імя Пранаса Гудзінаса Мастацкага музея Літвы.

З-за вялікай колькасці страт і пашкоджанняў былі праведзены амаль поўны дэмантаж арната, прадубляваны ўсе фрагменты з паясоў на шоўк, арнат набыў экспазіцыйны выгляд і з цягам часу знойдзе сваё месца на выставе «Беларусь: адраджэнне духоўнасці», а пазней — у экспазіцыі «Старажытная Беларусь».

Удзельнікі прэзентацыі змогуць не толькі ўбачыць рарытэт, якому вярнулі новае музейнае жыццё, ацаніць узровень і якасць працы, але і з дапамогай фотаздымкаў прасачыць асноўныя этапы яго аднаўлення, пачуць аповед пра праблемы і поспехі ў гэтай галіне ■



■ Асоба

# ЁН СЛУЖЫЎ БЕЛАРУСІ

## ПРА НЯПРОСТЫ ЛЁС БРАНІСЛАВА ТАРАШКЕВІЧА

**125 гадоў таму нарадзіўся выдатны дзеяч нашай зямлі, чалавек, чыя праца стала падмуркам для развіцця сучаснай беларускай мовы. Пра асобу Браніслава Тарашкевіча, яго ролю ў нацыянальным станаўленні разважалі на Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Там абмяркоўвалі таксама «вечна актуальныя» праблемы беларускага правапісу, граматыкі і наогул стану беларускай мовы ў двухмоўным грамадстве.**



### Узор для розных пакаленняў

— Калі глядзіш на беларускую рэчаіснасць і гісторыю праз прызму асоб, якія ў ёй былі, бачыш, колькі выдатных дзеячаў прысвяцілі сябе іншай зямлі. І такіх прыкладаў шмат, — адзначыла **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Алена АНІСІМ.** — Што датычыцца Браніслава Тарашкевіча, ён усім сваім жыццём служыў Беларусі. Натуральна, шлях у яго быў няпросты, як і тыя часы, у якія жыў. Але, таленавіты ад нараджэння, дзякуючы спрыянню добрых людзей ён раскрыў у сабе не толькі таленавітага мовазнаўцу, але і ўвасобіў выдатнага грамадскага дзеяча, які служыў менавіта свайму народу і культуры. Яго жыццёвы шлях — гэта ўзор і прыклад для розных пакаленняў беларусаў.

**Хацелі накіраваць Максіма Багдановіча, але ў таго было слабае здароўе. Тады выправілі крэпкага, чырванашчокага Браніслава, якога вылучылі браты Луцкевічы.**

З той думкай, што Браніслаў Тарашкевіч, як і многія іншыя дзеячы, шмат зрабіў для беларушчыны, згодны і **першы намеснік дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ.** Ён адзначыў, звяртаючыся да ўдзельнікаў канферэнцыі:

— Дзякуючы Тарашкевічу беларуская мова жыла, жыве і, я ўпэўнены, будзе жыць далей, якія б ні былі праблемы і складанасці. Найперш таму, што ёсць мы з вамі. Як казаў у канцы XX стагоддзя народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, усе плачуць, што беларуская мова памірае. Але, можа, таму і плачуць, што яна ніяк не памрэ?..

### Прадстаўнік «залатой моладзі»

Па драбніцах аднавіць карціну жыцця Тарашкевіча, уявіць, як складваўся лёс гэтага чалавека, дапамог **кандыдат філалагічных навук, прафесар Арсень ЛІС:**

«Браніслаў Тарашкевіч — прадстаўнік нашай «залатой моладзі» пачатку XX стагоддзя. Нарадзіўся ён у засценку Мацюлішкі, што на Віленшчыне, побач са старажытным трактам, які вёў з Вільні на Полацк. Першую адукацыю атрымаў у мястэчку Ла-варышкі. Яго падрыхтавала інтэлігентная жанчына з ваколіцы, якая ўбачыла ў гэтым хлопчыку здольнасці і моцную цягу да вучобы. Бацькі, як і ўсе сяляне ў той час, разважалі: «Можа, варта пакінуць сына на гаспадарцы як спадчынніка?» Затое дзед казаў: «Хлапец у вас расце здольны, пускайце яго ў навуку, дайце яму адукацыю».

Пачатковую грамату ён засвоіў у суседкі, трошкі падвучыўся ў мястэчку. Я наведваў Лаварышкі ў 1970-х гадах, хадзіў па ваколіцах. У той час там усе гаварылі на добрай беларускай мове. Я быў прыемна ўражаны, што дзеці гукаюць па-беларуску. І нават нізавая савецкая адміністрацыя размаўляла са мной на простай гаворцы.

Шчаслівы выпадак, што з 1906 года Тарашкевіч вучыўся ў Другой Віленскай беларускай гімназіі. Гэта былі неспакойныя часы, яшчэ не адпалыхала Першая руская рэвалюцыя 1905—1907 гадоў, якая адгукалася і на ўскраінах Расійскай імперыі. Тарашкевіч рос ва ўзбунтаваным грамадстве. Вызначальным было і тое, што тады ўжо працавала газета «Наша Ніва» — выданне, якое рабіла нацыю з беларусаў і аб'яднала вакол сябе першае пакаленне нацыянальнай інтэлігенцыі. Навучаючыся ў Вільні, ён кантактаваў з Вацлавам Ластоўскім, братамі Луцкевічамі. Ужо тады прасякнуўся той задачай, што стаяла перад ім і народам.

У 1911 годзе Тарашкевіч едзе ў Петраград ва ўніверсітэт і паступае на гісторыка-філалагічны факультэт. У той жа час стаў членам першай беларускай партыі, што дзейнічала нелегальна, — Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Уваходзіў ён і ў літаратурна-навуковы гурток, якім кіраваў выдатны беларускі асветнік Браніслаў Эпімах-Шыпіла. Там па суботах збіралася беларуская моладзь, вечарамі чыталі рэфераты, прысвечаныя гісторыі Айчыны. Ужо ў першы год навучання Тарашкевіч прачытаў тры даклады, прысвечаныя асэнсаванню беларускай грамадскай думкі. Яны былі зроблены на падставе пісьмовых матэрыялаў альбома Вярыгі-Дарэўскага. Там жа Тарашкевіч паспрабаваў абагульніць некаторыя назіранні за беларускай мовай.

Акадэмік Шахматаў, які ў свой час заступіўся за ўкраінскую мову, казаў: «Дайце мне вучня, філалагічна здольнага, каб ён у перспектыве заняўся беларускай мовай». Да яго хацелі накіраваць Максіма Багдановіча, але ў таго было слабае здароўе. Тады адправілі моцнага, чырванашчокага сялянскага хлопца Браніслава, якога вылучылі браты Луцкевічы.

Да канца 1917 года Тарашкевіч ужо завяршаў граматыку. Ён сам выпрацаваў лінгвістычныя тэрміны на беларускай аснове. Калі ў яго пазней пыталіся, як ён гэта зрабіў, Тарашкевіч адказваў, што карыстаўся вопытам напісання граматык рускімі, польскімі, чэшскімі лінгвістамі. Адносна тэрміналогіі раіўся з Шахматавым і Карскім, а таксама з сябрамі-студэнтамі з Беларусі.

Выдаць граматыку ў Петраградзе яму не ўдалося, хоць працаваў у камісарыяце, створаным беларусамі, бо там не было адпаведнага друкарскага рыштунку — беларускіх літар — і з паперай было цяжка. Тады ён звярнуўся ў Вільню і выдаў «Беларускую граматыку для школ» восенню 1918 года, на пачатку навучальнага сезона, у друкарні Марціна Кухты. Ён яшчэ не меў навуковай ступені, але па ініцыятыве Уласава для надання важкасці выданню пазначылі, што Тарашкевіч — дацэнт Петраградскага ўніверсітэта.

**Калі пыталіся, як ён гэта зрабіў, Тарашкевіч адказваў, што карыстаўся вопытам напісання граматык рускімі, польскімі, чэшскімі лінгвістамі.**

Граматыка адыграла вельмі вялікую практычную ролю. У ёй быў абагульнены вопыт той пісьменнасці, якая ўжо актыўна развівалася ў новай беларускай літаратуры другой паловы XIX і асабліва пачатку XX стагоддзя.

Чатыры выданні «Беларускай граматыкі для школ» выйшлі без якіх-небудзь змен. А пятую, ужо апынуўшыся ў польскай турме, ён дапрацаваў. Зыходзіў з таго, што большасць беларускіх школ у Заходняй Беларусі былі адкрыты фактычна ахвярнай самаадданай працай настаўнікаў.

У Заходняй Беларусі мясцовымі ўладамі закрываліся беларускія школы і настаўніцкія семінарыі. У тыя часы закрылі Будслаўскую, Барунскую, Свіслацкую беларускія настаўніцкія семінарыі... Палякі рабілі стаўку на тое, каб паланізаваць гэты край. Яны разумелі, што школьная асвета — моцны ачаг супраціўлення паланізацыі...»

Далейшы лёс стваральніка беларускай граматыкі быў змрочным. Па абмене палітзняволенымі яго накіравалі ў Савецкі Саюз. Аднак, прапрацаваўшы пэўны час, Тарашкевіч быў арыштаваны і ў 1937 годзе расстраляны.

* * *

Як адзначыў Аляксандр Лукашанец, далейшае развіццё беларускай мовы вельмі вагалася паміж рускай і польскай. У 1926 годзе адбылўся пераход з лацінскага на кірыліцкі алфавіт — гэта быў крок да збліжэння з рускай мовай. У 1933 годзе была праведзена рэформа беларускага правапісу, пасля якой на пісьме перасталі пазначаць асіміляцыйную мяккасць, змяніліся і правілы вымаўлення зычных у запазычаных словах: замест «плянета, клясычны», сталі казаць «планета, класічны». І гэта быў рэзкі ўхіл у бок збліжэння беларускай пісьмовай мовы з рускай пісьмовай мовай. Наступныя рэформы, на думку даследчыка, былі скіраваны на ўмацаванне нацыянальных адметнасцяў ва ўмовах беларуска-рускага двухмоўя ■

■ Слуцкія паясы

# Золата, серабро, кветкі...

## Музей гісторыі Магілёва набыў каштоўны рарытэт

**Нядаўна фонды Музея гісторыі Магілёва папоўніліся слуцкімі паясамі, а дакладней, іх фрагментамі. Тут набылі літургічнае покрыва (аналойнік), упрыгожанае арыгінальнымі тканымі вырабамі, створанымі калісьці ў Слуцку.**

Як адзначыў **дырэктар музея Аляксей БАЦЮКОЎ,** гэты набытак сапраўды бясцэнны. Раней вяліся перамовы аб магчымасці купілі цэлага пояса, зробленага на ўзор слуцкага. Але тады патрэбна было назбіраць досыць вялікую суму — гэтага своечасова зрабіць не атрымалася. Да таго ж той выраб датуецца больш познім часам. У аналойніку, набытым нядаўна, выкарыстаны «тыя самыя» арыгінальныя слуцкія паясы — таму гэта вельмі каштоўны музейны экспанат. Магчыма, першапачаткова з паясоў зрабілі святарскую рызу, а ўжо пазней яна была выкарыстана для вырабу аналойніка. Дарэчы, покрыва ўпрыгожана таксама фрагментамі дзвюх іншых каштоўных тканін — з залатымі і сярэбранымі ніткамі.

Грошы на набыццё выдаткаваны з дзяржаўнага бюджэту. Адразу пасля куплі каштоўную рэч накіравалі на экспертызу ў Нацыянальны мастацкі музей, дзе была атрымана кансультацыя рэстаўратара. Поясу зрабілі спецыяльную ачыстку. І вырашана было выстаўляць яго два разы на год — кожны раз на працягу месяца. Бо патрабаванні да захавання тканых вырабаў даволі жорсткія — яны могуць знаходзіцца пад уздзеяннем святла толькі пару месяцаў на год, а ў астатні час павінны захоўвацца ў фондасховішчы, дзе забяспечваецца патрэбны тэмпературна-вільготны рэжым.


Слуцкі пояс, што захоўваецца ў Музеі гісторыі Магілёва.

У магілёўскім музеі пояс можна будзе ўбачыць у чэрвені — экспанаванне прымяркуюць да Дня горада. Аляксей Бацюкоў адзначае, што пояс, магчыма, выкліча вялікую цікавасць у наведвальнікаў. Некаторыя з іх адзначаюць, што спецыяльна завітаюць, каб паглядзець на рарытэт.

Слуцкія паясы, якія былі выкарыстаныя для аздаблення аналойніка, былі зробленыя ў Слуцку ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя. Гэта былі чатырохбаковыя кунтушовыя паясы з кірылічнай меткай у кутах аднаго з канцоў «СЛУЦКЕ». Аналагічны пояс знаходзіцца ў фондах Нацыянальнага музея ў Варшаве, і не так даўно яго прывозілі на часовае экспанаванне ў Нацыянальны мастацкі музей у Мінск.

У набыцці каштоўнага экспаната музею паспрыялі Раман Крыцук і Андрэй Радкоў. Дарэчы, дзякуючы стараннам апошняга ў свой час экспазіцыю папоўніў і арыгінальны Трэці Статут Вялікага Княства Літоўскага.


На набыццё кнігі «Апостал» Спірыдона Собаля цяпер актыўна збіраюць сродкі.

Варта адзначыць, што ў Музеі гісторыі Магілёва вядзецца актыўная работа па набыцці каштоўнасцяў. Паколькі сам музей размяшчаецца ў ратушы, то асаблівая ўвага ўдзяляецца пошуку і куплі ў прыватных асоб гісторыка-культурных каштоўнасцяў, адпаведных ведучай экспазіцыйнай тэматыцы музея — «Магілёў эпохі Магдэбургскага права». Аднак не пакідаюць па-за ўвагай і іншыя помнікі культуры, што рэпрэзентуюць духоўную спадчыну горада Магілёва і ўсёй Беларусі. Не так даўно тут набылі шаблю-«касцюшкоўку», камергерскі ключ Станіслава Аўгуста Панятоўскага, кнігі «Часоўнік», «Псалтыр» і многае іншае. Некаторыя калекцыянеры набываюць каштоўныя прадметы для сябе, але пэўны час выстаўляюць іх у музеі — напрыклад, твор Вітольда Бялыніцкага-Бірулі (эскіз да карціны «Веснавыя воды») 1930 года можна будзе бачыць у ратушы падчас тэматычных выстаў і мерапрыемстваў.


Эскіз карціны «Веснавыя воды» Вітольда Бялыніцкага-Бірулі.

Часам прыватныя асобы робяць ахвяраванні на набыццё канкрэтных экспанатаў. Напрыклад, Алесь Чайчыц з Масквы прыдбаў для музея кнігу «Дзіўныя паведамленні пра езуітаў у Беларусі» XVIII стагоддзя, а Андрэй Прынеслік з Масквы — набор паштовак з відамі Магілёва пачатку XX стагоддзя. Сродкі на набыццё перавыдадзенага ў 1744 годзе асобніка Трэцяга Статута Вялікага Княства Літоўскага выдаткаваў пісьменнік Валерый Казакоў.

Цяпер вядзецца збор сродкаў на набыццё кнігі «Апостал», выдадзенай Спірыдонам Собалем у Куцейне ў 1632 годзе, — неабходна сабраць каля 10 000 USD. Усе ахвотныя могуць пералічваць грошы на дабрачынны рахунак музея ■

Матэрыялы падрыхтавала Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
nina@zviazda.by

Звязда Падарожжа праз 100-годдзе

# ЯК «ЗВЯЗДА» ПІСАЛА ГІСТОРЫЮ (1928—1937)

**Напярэдадні стагадовага юбілею «Звязда» працягвае гартаць старыя газетныя падшыўкі, каб прыгадаць, якім бачылі і адлюстроўвалі жыццё Беларусі ў мінулым стагоддзі нашы калегі-журналісты. Сёння на чарзе — няпросты дзесяцігадовы адрэзак з 1928 па 1937 год, які ўмясціў у сябе індустрыялізацыю і калектывізацыю, шырокую антырэлігійную кампанію і барацьбу з ухіламі ад генеральнай лініі партыі, прыняцце новых канстытуцый СССР і БССР, аднадзёны і прызнаны пазней несапраўдным перапіс насельніцтва і рэформу беларускага правапісу, стаханаўскія рэкорды і рэпрэсіі «ворагаў народа»...**




У 1929 годзе газета прымала ўдзел у фотаконкурсе, абвешчаным Цэнтральным саветам прафсаюзаў Беларусі, і вылучыла сваю прэмію для найлепшага аматарскага фотагуртка.

## СУПРАЦЬ НЕПІСЬМЕННАСЦІ, П'ЯНІЦ І... БЮРАКРАТАЎ

Мяркуючы па газетных публікацыях, Беларусь канца 1920-х стаіць на трох кітах калектывізацыі, кааперацыі і індустрыялізацыі — поспехі і новыя задачы ў гэтым рэчышчы разглядаюцца з нумара ў нумар. Але, вядома, хапае ў маладой рэспубліцы і нявырашаных пытанняў.

**Не вытрымаўшы цкавання, першы народны паэт Беларусі Янка Купала зрабіў спробу самагубства. Абвінавачанні з паэта ў рэшце рэшт знялі, але якой цаной!**

Вось што падкрэслівае ў артыкуле *«На сучасныя тэмы»* тагачасны старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў (*тагачасная арфаграфія захавана. — «Зв.»*): *«Галоўнымі перашкодамі на шляхах далейшага сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі трэба лічыць недастатковую пісьменнасць нашага насельніцтва і амаль што поўную адсутнасьць добрых дарог. ...Мы бачым, што такія рэчы, як радыё, кіно, трактар, электрычнасьць і іншыя, што павінны быць звычайнай, самай неабходнай прыладай нашага жыцьця, пакуль што існуюць, як нешта надзвычайнае, дзіўнае. А часта бывае і так: ёсьць гучнагаварыцель-радыё, але ён маўчыць (50 проц. усіх радыё-установак на вёсцы маўчаць), ёсьці кіно-апарат, але не працуе, ёсьць трактар — няма трактарыста, ёсьці агранамічная станцыя, але і сам аграном купляе капусту. І няма ведаў, уменьня, навыкаў у людзей, каб паставіць, пусьціць, пакіраваць машынай. Гэта наша агульная бяда. Нам трэба выйсьці з бяды».*

Дзеля гэтага, у прыватнасці, усё больш напружана працуюць тэхнікумы і ВНУ — апошнія павялічваюць прыём, прываблівають таленавітых студэнтаў стыпендыямі і робіцца ўсё больш прэстыжнымі: так, у 1928 годзе на 712 месцаў у ВНУ пададзена 1700 заяў.

Наконт якасці школьнай адукацыі «Звязда» наогул разгарнула шырокамаштабную грамадскую дыскусію «Чым хварэе наша школа». *«Настаўнік у пагоні за вялікімі заробкамі набірае па 35—40 тыднёвых гадзін усюды, дзе толькі можна. Ці можа такі настаўнік быць выхаваўцам? Вядома, не. Ён толькі тое і робіць, што бяжыць са школы ў школы і «дае лекцыі»*, — прызнаюць удзельнікі гэтага «абгаварэньня хібаў і недахопаў выхаваўчай працы».

Яшчэ адна тэма, што выразна прасочваецца на газетных старонках — антырэлігійная прапаганда. У 1929 годзе ў Мінску нават праходзіць І Усебеларускі з'езд бязбожнікаў, у якім удзельнічаюць 50 дэлегатаў-актывістаў з усіх рэгіёнаў. Праўда, значная іх частка не зацятыя барацьбіты з рэлігіяй, а гэткія хітраватыя філосафы кшталту 68-гадовага бязбожніка Івашкі з Бабруйшчыны, які сказаў карэспандэнту «Звязды» літаральна наступнае: *«Няма чаго глядзець на неба, у гэтым мы ўпэўніліся. Нас стагоддзямі ашуквалі. Зараз мы кажам: ты, бог, сядзі сабе на небе, а мы на зямлі будзем рабіць, што хочам».* І тым не менш антырэлігійныя артыкулы друкуюцца рэгулярна, асабліва напярэдадні «царкоўных святаў» — Каляд, Вялікадня і г.д., у якія рабочых заклікаюць выходзіць на працу і пры тым адлічваць заробак у фонд індустрыялізацыі краіны.

На чарговы віток выходзіць барацьба з алкагалізмам, у якую ўносіць пэўную лепту і «Звязда», прадстаўляючы чытачам «галерэю злосных алкаголікаў» з канкрэтнымі прозвішчамі і апісаннямі «подзвігаў». *«За 15 дзён лістапада міліцыя затрымала ў п'яным выглядзе 66 рабочых і служачых, з іх 17 будаўнікі, па 4 — друкары і харчавікі, па 3 — транспартнікі і чыгуначнікі... А колькі рабочых п'юць дома і ў півных, але не трапляюць у міліцыю, бо ў іх «характар спакойны!»* — з абурэннем зазначае газета.

Селькоры і рабкоры па ўсёй краіне рэгулярна складаюць так званы лісток рабоча-сялянскай інспекцыі «Пад агонь крытыкі мас!», праз які гучна распісваюць прыклады адміністрацыйнага свавольніцтва. Таксама ў канцы 1920-х становіцца рэгулярнай рубрыка «Звязда дапамагла» — рэха газетных публікацый, паводле якіх адказныя асобы на месцах праводзілі праверкі і паказальную барацьбу са спекулянтамі, бюракратамі і г.д.




Святочны 5000-ы нумар «Звязды» выйшаў павялічаным у некалькі разоў тыражом.

## ВЫКАНАЦЬ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ

У 1929 годзе бяруць старт адразу дзве новыя ідэі — сацыялістычнае спаборніцтва і барацьба з «прагуламі, разгільдзяйствам і працоўнай расхлябанасцю». *«Працоўным уздымам мільёнаў зьмяцем дэзертыраў вытворчага фронту!»* — заклікала «Звязда», паведамляючы, што рабочыя Добрушскай папяровай фабрыкі ў першы ж дзень сацспаборніцтва павялічылі дзённую выпрацоўку паперы з 33 да 44 тон і ўрачыста паабяцалі, што за колькасцю будзе ісці следам і якасць.

У сацспаборніцтва ўключаюцца нават... рэдкалегіі насценгазет, якія абяцаюць, у прыватнасці, *«у заметках асьвятляць пытаньні палітычна-грамадзкага значэньня і ні ў якім выпадку не зьмяшчаць матэрыялаў асабістага склочнага характару»* і *«больш разгарнуць масава-выхаваўчую работу сярод рабселькораў».*

У БССР у межах спаборніцтва праходзіць пераклічка калгасаў і прадпрыемстваў імя У.І. Леніна — кожны мусіць зрабіць справаздачу аб сваіх дасягненнях і даць павышаныя абавязацельствы аб перавыкананні вытворчых планаў.

Выканаць і перавыканаць — гэта наогул адзін з самых распаўсюджаных заклікаў у вытворчасці і сельскай гаспадарцы. Вось тыповыя для 30-х загалоўкі артыкулаў «Звязды», якія гавораць самі за сябе: *«Зябліву — ударны тэмп!», «Торфазавод «Шлях сацыялізму» перавёў машыны на кругласутачную работу», «600.000 тон сена другога ўкосу — у кармовы баланс», «За 1000 сьвінаматак!», «Да 1 кастрычніка, не пазней, пусьціць 11 ільназаводаў».*

А вось проста ўзорная заметка 1931-га: *«Бабруйскія будаўнікі пабілі ўсесаюзны рэкорд па складваньні стандартных дамоў. 18 жніўня рабочыя-будаўнікі пад кіраўніцтвам лепшага тэхніка-ўдарніка Кільчэўскага склалі стандартны дом на працягу 20 гадзін у той час, калі звычайна на гэту работу траціліся тры тыдні».* Цікава, ці многія з нас сёння пагадзіліся б жыць у такім «ударна ўзведзеным» доме?

У 1932 годзе «Звязда» пачынае публікаваць так званыя «Чырвоную і Чорную дошкі» — спісы ўдарнікаў сельскай гаспадаркі і, адпаведна, тых, хто адстае. Калі першых ухваляюць і ўсяляк заахвочваюць, то кіраўнікоў «правальных» гаспадарак за зрыў тэмпаў сяўбы альбо ўборачнай могуць папросту зняць з пасады. Таму газета нястомна падганяе «разгільдзяяў» і патрабуе ва ўльтыматыўнай форме: *«Ні адной бульбіны не пакінуць у полі», «Па-баявому падрыхтавацца да веснавой сяўбы», «Поўнасьцю ссыпаным і ачышчаным насеньнем, добраякасна адрамантаваным трактарам сустрэць бальшавіцкую вясну!».* Дзеля большага заахвочвання ўдарнікаў у 1935 годзе ў Мінску перад Домам урада, як згадвае газета, усталявана Дошка гонару, куды заносіліся «асоба-выдатныя калгасы, якія ўсёй сваёй работай і выкананнем абавязацельстваў перад дзяржавай, сваёй згуртаванасцю вакол партыі і савецкай улады даказалі на справе, што яны заслужылі звання самых лепшых калгасаў БССР».

У 1935 годзе ўдарная праца і перавыкананне вытворчых нормаў набылі новае дыханне з пачаткам стаханаўскага руху — паслядоўнікі данбаскага шахцёра А. Стаханава, які за змену здабыў 102, а крыху пазней 227 тон вугалю пры норме ў 7 тон, адзін за адным паказвалі недасяжныя раней працоўныя вынікі. «Звязда» прысвяціла беларускім стаханаўцам увесь святочны першамайскі нумар 1936-га, даводзячы фактамі, што «жыць стала лепш, жыць стала весялей».

## ЧОРНЫЯ ПЛЯМЫ «ГЕНЕРАЛЬНЫХ ЧЫСТАК»

У 1929—1930 гг. паводле рашэння XVI канферэнцыі ВКП(б) праходзіць «генеральная» агульнапартыйная чыстка. *«Шырока разгортваючы крытыку і самакрытыку, сваячасова выпраўляючы памылкі і хібы ў практыцы праверкомаў, узнімем праверку і чыстку партыі на яшчэ большую прынцыповую, палітычную вышыню. Трэба скарыстаць чыстку партыі для ўзмацненьня барацьбы з тэорыяй і практыкай правага апартунізму і прымірэнцтвам да яго, а таксама з «левымі» загібамі і рэцыдывамі трацкізму»,* — пералічвае «Звязда» арыенціры маштабнай праверкі камуністаў на адпаведнасць генеральнай лініі партыі.



У 1935—1936 гг. стаханаўцы былі частымі героямі газетных публікацый.

Да гэтага часу з вясковых ячэек ужо выключаны ўсе *«падкулачнікі і п'яніцы»*, а таксама наогул усе падазраваныя ў *«правым ухіле»*. Акрамя таго, чыстка распаўсюдзілася на беспартыйных служачых савецкіх устаноў.

...«Класава чужынскія», варожыя элементы ў 30-х гадах правяраючыя розных рангаў шукалі не толькі ў вёсці і на вытворчасці, але і ў колах інтэлігенцыі — сярод навукоўцаў, у тым ліку акадэмікаў, вядомых літаратараў, грамадскіх дзеячаў. Адным з трывожных званочкаў стала разгорнутая на старонках «Звязды» дыскусія «Аб шляхох развіцця беларускага тэатру», ініцыятары якой патрабавалі ад дзеячаў мастацтва *«шырока разгарнуць крытыку дробна-буржуазнай ідэалёгіі і барацьбу з рознымі відамі прымірэнства»*, заклікаючы стварыць *«культуру нацыянальную па форме і пралетарскую па зьмесце»*. Тыя ж, хто, на думку назіральнікаў з НКУС, дапускаў *«хістаньні»* і быў насуперак згортванню палітыкі нацыяналізацыі савецкіх рэспублік заўважаны ў *«адраджэнскіх настроях»*, браліся пад асаблівую ўвагу і кантроль. Партыйная рыторыка *«рашучай барацьбы з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму»* пакрысе змяняецца на заклік *«Усе на вайну супраць мясцовага нацыяналізму!»*.

У 1930 годзе ДПУ распачала сумнавядомую справу «Саюза вызвалення Беларусі» — міфічнай нацыяналістычнай антысавецкай, контррэвалюцыйнай арганізацыі, лідарам якой нібыта з'яўляўся Янка Купала. Адпаведная кампанія па фарміраванні грамадскай думкі праходзіла ў прэсе. Так, у маі 1930 года «Звязда» надрукавала ўзгоднены на найвышэйшым узроўні — у ЦК КП(б)Б — артыкул вядомага ідэолага Л. Бэндэ «Шлях паэта», дзе Купала быў названы *«ідэолагам буржуазнага нацыянал-адраджанізму»*. А ўжо ўлетку адбыліся арышты і абвінавачанні — тагачаснага старшыні Акадэміі навук Усевалада Ігнатоўскага, пісьменніка і старшыні Саўнаркама БССР Зміцера Жылуновіча, акадэмікаў Вацлава Ластоўскага і Язэпа Лёсіка, рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты, гісторыка Фёдара Забелы і іншых (усяго звыш 100 прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі). Не вытрымаўшы цкавання, першы народны паэт Беларусі Янка Купала зрабіў спробу самагубства. Абвінавачанні з паэта ў рэшце рэшт знялі, але якой цаной! У снежні 1930 года на старонках «Звязды» як адной з самых уплывовых беларускіх газет быў апублікаваны пакаянны «Адкрыты ліст» з яго подпісам (як лічаць многія даследчыкі, напісаны ніяк не цяжка хворым Купалам, а ўсё тым жа ідэолагам Бэндэ): *«Не магу змоўчаць і павінен тут выказаць свой гарачы пратэст і вялікае абурэнне супраць таго, як яны, гэтыя нацыянал-фашысты, служаць сацыяльна-нацыянальнаму вызваленчаму руху Зах. Беларусі, якая стогне пад пятою акупантаў... Буржуазія, як замежная, так і ўнутраная, не перабірае ніякімі метадамі і сродкамі барацьбы супроць СССР. Шкодніцтва, дыверсія, шпіёнства, інтэрвенцыя — усё гэта пускаецца ў ход, каб толькі зруйнаваць такія бастыёны сацыялізму, як індустрыялізацыя і калектывізацыя, абы толькі ўзарваць пяцігадовы план, які ажыццяўляецца нечуваным уздымам і захапленнем рабочага класа і бядняцка-серадняцкага сялянства пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі...»* Усяго па справе «Саюза вызвалення Беларусі» было асуджана 86 чалавек.


ТОРФАЗАВОДЫ „ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК" І „ЛЕНІНСКІ
ІДУЦЬ ДА ПЕРАМОГІ

НА ПРЫКЛАДАХ ЛЕПШ
вучыцца барацьбе за тран

Фарсаваць сулабудаўніцтва Н.-Беліцы

39,5

40,2

41,3

40,9

41,8

Сустрэчны плян каманды параходу „Вялiся"

Ад праміяваных лепшых брыгад і брыгадзіраў па здабычы торфу

Здабыча торфу на 13 чэрвіня

Выкананне планаў у прамысловасці і народнай гаспадарцы ў 1930-я кантралявалася літаральна штодня.

Наступная «генеральная чыстка», якая ішла на працягу 1933 года, стала яшчэ больш масавай — «вычышчэнню» падлягалі класава чужынскія і варожыя элементы, кар'еристы, шкурнікі і бюракраты; словам, як зазначыў М. Галадзед на старонках «Звязды», усе *«элементы, якія разлажыліся, перарадзіліся і прымазаліся»*. Пад маркай барацьбы прайшоў цэлы шэраг гучных судовых спраў — напрыклад, па справе *«контр-рэвалюцыянераў-шкоднікаў з Белдзяржснабу»*, за ходам якой пільна сачыла «Звязда». Абвінавачваліся ў раскрадanні дзяржмаёмасці звыш 20 чалавек, ад *«калчакоўцаў»*, *«спекулянтаў і гандляроў»* да малапісьменных сялян. Для 10 фігурантаў пракурор запрасіў вышэйшую меру пакарання; яшчэ дзесяць чалавек атрымалі 10 гадоў пазбаўлення волі з высылкай і канфіскацыяй. *«Злодзеям грамадскай уласнасці, якія хочуць гэтым затрымаць наша сацыялістычнае будаўніцтва, ня можа быць ніякай літасці»*, — даводзіць карэспандэнт «Звязды», наўрад ці прадбачачы, што і ў самой рэдакцыі неўзабаве будуць выяўленыя «ворагі».

Але, бадай, найстрашней гартаць старонкі «Звязды» за 1937-ы. Вось выцягка з артыкула «Калі вораг не здаецца — яго знішчаюць»: *«Паведамленне пракуратуры СССР аб выкрыцці органамі НКУС трацкісцкага «паралельнага цэнтра» ў складзе Пятакова, Радэка, Сакольнікава, Серабракова і іншых выклікала велізарнае народнае абурэнне да тройчы праклятых ланцуговых сабак фашызма. ...Тысячны калектыў рабочых мінскага вагонарамонтнага завода выказвае сваё абурэнне і знявагу да трацкісцкага-агентаў фашызма. У прынятай рэзалюцыі рабочыя пішуць: «Нiхай рука правасуддзя не дрогне. Мы просім Вярхоўны суд расстраляць гэтых гадзюк»*. Да рабочых, сцвярджаецца ў публікацыі, далучыліся работнікі Белдзяржкіно, працоўныя Палесся... А ў канцы месяца — фота масавых выступленняў рабочых і жудасныя загалоўкі «Аднадушна адабраем прыгавор» і «Наша патрабаванне выканана». Прытым пра куды больш значную і страшную для беларусаў падзею — масавы арышт і расстрэл у Мінску ў кастрычніку 1937-га каля 100 выдатных прадстаўнікоў нацыянальнай культуры — «Звязда» захоўвае поўнае маўчанне. Магчыма, таму, што ў гэты час яе саму ўжо вывучаюць пад лупай, жорстка кантралюючы з усіх бакоў. Так, расстраляны за *«антысавецкую дзейнасць»* былы рэдактар Станіслаў Будзінскі, які рэдагаваў «Звязду» ў кастрычніку 1930-га — лістападзе 1931 г. Зняты з пасады, а потым расстраляны Навум Ленцнер (рэдактар «Звязды» ў чэрвені газеце 1934-га — студзені 1935 г.), а паралельна з працы ў звольнены амаль тры дзясяткі чалавек. Абвінавачаны за *«трацкісцкую лінію»* і расстраляны загадчыкі аддзелаў рэдакцыі П. Салтаноўскі і Р. Гінзбург. Арыштаваны — і ў 1938-м будзе расстраляны — Рыгор Брагінскі, рэдактар «Звязды» ў верасні 1932-га — маі 1934 г. Неўзабаве будзе арыштаваны таксама былы рэдактар газеты Мікалай Сцернін (рэдагаваў са студзеня 1935 г. па жнівень 1936-га), чый далейшы жыццёвы шлях да канца невядомы... Лёс усіх гэтых людзей для большасці чытачоў згубіўся недзе ў міжрадкоўі газетных публікацый.

### «ЗВЯЗДА» І «САВЕЦКІЯ РЭФОРМЫ»

У 1933 годзе пачынаецца фактычна рэформа жыццёвага ладу беларусаў — пашпартызацыя. *«Прэзідыум Менскага гарсавету даручыў міліцыі да 1 лютага скончыць работу па ўвядзенні новых дамовых кніг і явачных картак. Выдача пашпартоў павінна пачацца не пазней 1 лютага»*, — паведамляе «Звязда». Зрэшты, на справе пашпартызацыя пачалася толькі ў красавіку.

З 15 верасня 1933 года ўведзены рэфармаваны пастановай СНК БССР беларускі правапіс. (Беларуская мова, а адпаведна і «Звязда», губляюць мяккі знак, які абазначаў на пісьме мяккае вымаўленне («жыцьцёвы», «сёньня» і г.д.), затое набываюць чужародны «о» ў словах кшталту «совецкі», «соцыялістычны», «пролетарыят». Вось што пафасна заяўляе нарэшце гэтага рэдакцыйная перадавіца 16 верасня 1933-га: *«Галіна мовы — таксама ўчастак класавай барацьбы. Беларускія нацыянал-дэмакраты працягнулі свае шкодніцкія рукі і сюды. Яны, абвясціўшы сябе манапольнымі «абаронцамі чыстаты роднага слова», перартварылі тагачасны інстытут мовы пры Акадэміі навук у цытадэль контр-рэвалюцыі. Успомнім, з якім шаленствам Ластоўскія, Лёсікі і іх паслядоўцы імкнуліся выгнаць з беларускай мовы ўсякае новае рэвалюцыйнае слова, напрыклад, слова «пралетарый», і замяніць яго словам «убоства»*... Пастанова СНК *БССР аб зменах і спрашчэнні беларускага правапіса — магутная зброя барацьбы за далейшы росквіт беларускай нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па сваім зместу культуры»*.

Ужо з абноўленай назвай «Звязда» прыйшла да своеасаблівага творчага юбілею — выхаду 30 ліпеня 1934 года 5-тысячнага нумара. Свае віншаванні ў адмысловы святочны выпуск газеты даслалі не толькі партыйныя кіраўнікі і дзяржаўныя дзеячы розных узроўняў, але таксама беларускія пісьменнікі — Якуб Колас, Янка Купала, Пятро Глебка, Міхась Лынькоў, Кузьма Чорны ды іншыя. Кампазітары Самохін і Любан у гонар 5000-га нумара «Звязды» стварылі песенныя творы на словы Янкі Купалы і Петруся Броўкі. У Мінску спецыяльна да юбілейнага нумара «Звязды» было прымеркавана лёгкаатлетычнае свята на прызы рэдакцыі, а шэраг калгасаў, напрыклад, з Полацкага, Заслаўскага і іншых раёнаў, арганізавалі масавыя хлебныя «чырвоныя абозы імя «Звязды».

Знакавай падзеяй 1937 года мусіў стаць усесаюзны перапіс насельніцтва, у які ўпершыню было ўключана пытанне аб рэлігіі. «Звязда» амаль месяц праводзіла папярэднюю падрыхтоўчую работу для лічыльнікаў і насельніцтва, даводзячы, як трэба адказваць і запісваць адказы на пытанні пра веравызнанне, нацыянальнасць і родную мову. Перапіс сапраўды адбыўся 6 студзеня, у тым ліку па ўсіх 38 631 населеным пункце БССР, але яго вынікі так і не былі апублікаваныя.

...Між тым нават у змрочным 1937-м жыццё працягвалася. Вынаходнікі і рацыяналізатары прапаноўвалі свае ідэі для сельскай гаспадаркі і прамысловасці, лектары чыталі ў Доме партасветы даклад на тэму «У барацьбе з якімі ворагамі партыя Леніна-Сталіна дабілася перамогі сацыялізма ў СССР»; трэст «Галоўхлеб» пачынае выпякаць новы гатунак хлеба «Барадзінскі»; з друку выйшаў двухрублёвы зборнік песень, вершаў, апавяданняў і гульняў пад назвай «Навагодняя ёлка» на беларускай і рускай мовах; стаханаўцы Мінска ўдарна рыхтаваліся да 1938 года, каб выканаць трэцюю пяцігодку — план развіцця народнай гаспадаркі. Ці адчувала «Звязда», а разам з ёй і чытачы, блізкі подых Вялікай Айчыннай вайны? Паспрабуем давядацца са старых падшывак у наступным падарожжы праз стагоддзе.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

■ Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

**Палявая Рэчыца**
**Жабінкаўскага раёна**

# «ПОМНІК ДАГЛЯДАЕМ УСЕ РАЗАМ»

**Палявая Рэчыца — самы аддалены населены пункт Сцяпанкаўскага сельсавета. Са Сцяпанак трэба ехаць амаль 10 кіламетраў лесам. Але з боку Пружанскага раёна недалёка праходзіць шаша Пружаны—Відамля, таму нельга сказаць, што вёсачка зусім згубілася сярод лясоў. Дабрацца сваім транспартам сюды ў любы час — не праблема.**


Стараста вёскі Алена БУДЗЬКО і старшыня сельскага Савета Мікалай ЯГОРЧАНКАЎ.

— У нас выходзіш з хаты і адразу бяры грыбы, лісічак многа, а таксама суніцы, чарніцы, маліны — усё фактычна за хлявом расце, быў бы сілы і ахвота збіраць, — расказвае **Алена БУДЗЬКО**. — А вясной тут прыгажосць, птушкі пяюць, як у раі. Усё ўгаворваю сваіх суседзяў: ну што вас трымае ў горадзе? Абое ж на пенсіі, пераязджалі б, жылі на свежым паветры. Хоць было б з кім пагаварыць. А то сядзішь на сваім паверсе, а летам становяцца дачнікамі ў бацькоўскай хаце.

Яшчэ Алена Іванаўна расказала пра адну асаблівасць сваёй вёскі. Большасць хат складзены з пушчанскай драўніны. Раней людзі не так нарыхтоўвалі бярвенні, як цяпер. Напрыклад, рэзалі дрэва ў строга вызначаны час, потым вытрымлівалі колькі трэба, старанна высушвалі, таму будаўнічы матэрыял станавіўся асабліва трывалым. І цяпер некаторыя з жыхароў, хто ставіць новыя вокны ці дзверы, адзначаюць, як цяжка бывае свідраваць загатоўкі. Адно слова — пушчанскае дрэва!

Бацька Алены Іванаўны некалі ўзвёў такую ж хату, дзе выраслі яе дзеці і дзе яна жыве да гэтай пары. Сёлета Алена Будзько можа адзначаць 20-годдзе, як стала старастай у Палявой Рэчыцы. Выбралі яе аднавяскоўцы, калі яшчэ вёска была не такой маленькай, як цяпер. Так і застаецца яна лідарам да гэтай пары.

У 70-х гадах мінулага стагоддзя тут значылася больш за 130 жыхароў. Былі школа і магазін. Па дзве каровы на кожным падворку трымалі, згадвае стараста, свіней, птушкі рознай было ў кожнага гаспадара, бо тутэйшыя людзі — працавітыя. Першая пасляваенная школа, дарэчы, размяшчалася ў доме бацькоў Алены Будзько. Потым пабудавалі новую. Але з часам людзей стала менш. Старыя адыходзілі, маладыя з'язджалі ў гарады. Закрылі школу, потым магазін. І цяпер у Палявой Рэчыцы афіцыйна значацца 13 жыхароў. Праўда, не ўсе яны пенсіянеры. Двое яшчэ працуюць на ферме.

**Раней людзі не так нарыхтоўвалі бярвенні, як цяпер. Напрыклад, рэзалі дрэва ў строга вызначаны час, потым вытрымлівалі колькі трэба, старанна высушвалі, таму будаўнічы матэрыял станавіўся асабліва трывалым.**

— Цяпер працаваць добра нават у калгасе, — разважае стараста і былы палявод. — Умовы не тыя, што раней. А некалі мы буракоў за лета амаль па пяць гектараў праполвалі. А яшчэ з тых дзялак трэба было сабраць ураджай ды пагрузіць у машыну.

Нялёгкую працу палявода згадала і **самая пажылая жыхарка Палявой Рэчыцы Ганна ДУЛЕВІЧ**. 87-гадовая Ганна Паўлаўна кажа, што самае цяжкае пры яе невысокім росце было тыя буракі закідаць у грузавік: «Накідаешся за дзень, што спіны не чуеш».

На пакаленне гэтай жанчыны выпалі ўсе пасляваенныя цяжкасці. Бацька вярнуўся з вайны паранены, хворы і вельмі хутка памёр. Маці засталася з пяцярымі дзецьмі на руках, яна, Ганна, самая старэйшая. Таму, можна сказаць, што меншых паднімалі разам з маці. З юнацтва Ганна ездзіла на заробкі ва Украіну, каб прывезці дадому якую капейку. Была і ў Днепрапятроўску, і ў Нікалаеўскай вобласці. Потым вярнулася дадому, тут выйшла замуж, працавалі з мужам у калгасе, выгадавалі дзяцей. І ўжо хутка трыццаць гадоў, як Ганна Паўлаўна адна. Муж памёр нестары. Раней і адна гаспадарку трымала, цяпер засталіся толькі куры, бо руплівая гаспадыня не ўяўляе сабе, як наогул сядзець на пустым падворку. Дзеці да сябе клічуць, але бабулька не хоча. Кажа, што сябе яшчэ патроху даглядае. Пенсія ёсць, аўтакрама прыходзіць тры разы на тыдзень, можна купіць, што захочаш.

**«Масквічы тут купілі дом. Прыязджаюць летам на месяц альбо два, адпачываюць. Для адпачынку лепшых мясцін і не трэба».**

Канчаткова засумаваць не дае тэлевізар. Пенсіянерка рэгулярна глядзіць навіны, а яшчэ такія перадачы, як «Поле цудаў» альбо «Чакай мяне». А пагаварыць, ну, хіба стараста калі зойдзе. «Вось летам у нас людзей шмат, усе дачнікі з'язджаюцца: і з Масквы, і з усяго свету людзі бываюць», — кажа бабулька.

— Сапраўды, — дадае Алена Будзько, — масквічы тут купілі дом. Прыязджаюць летам на месяц альбо два, адпачываюць. Для адпачынку лепшых мясцін і не трэба. У адной з сям'і тых масквічоў дзед тут партызаніў і пахаваны за вёскай — Шульган Антон Васілевіч. Вось жыхароў расійскай сталіцы і цягне ў родныя мясціны, дзе карані. Дом свой маскоўскія дачнікі добраўпарадкавалі, летам абкошваюць тэрыторыю, не забываюць і кветак да помніка панакласці.

Алена Іванаўна вядзе да галоўнай вясковай славутасці — помніка ахвярам вайны. Па дарозе расказвае трагічную гісторыю, якую ведае ад сваіх бацькоў. У 1941-м годзе ў цяжкім баі пры адступленні загінулі 11 савецкіх салдат. Іх пахавалі бацькі Алены разам з суседзямі. Загадкавым чынам зніклі дакументы тых салдацікаў. Расказвалі, што паперы знішчыў псіхічна не вельмі здаровы чалавек. Такім чынам, усе байцы засталіся невядомымі. Пазней у тую брацкую магілу падхавалі партызана Шульгана, якога расстралялі немцы пазней. Вяскоўцы заўсёды шанавалі і глядзелі магілу, а ў 1969 годзе тут паставілі помнік. На маё пытанне, хто даглядае памятнае месца, стараста сціпла адказала, што школьнікі прыязджаюць, сельскі Савет дапамагае. А **старшыня сельскага Савета Мікалай ЯГОРЧАНКАЎ** паправіў: «Найлепш гэта робіць Алена Іванаўна».

Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, на 9 Мая тут заўсёды праводзіцца памятнае мерапрыемства. Як правіла, прыязджаюць масквічы, збіраюцца ўсе жыхары Палявой Рэчыцы і яе дачнікі, прадстаўнікі сельскага Савета і мясцовай гаспадаркі, каб згадаць тых, хто загінуў у баях за свабоду гэтых мясцін.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by* ■

# СПАДЧЫНА ЧЫНГІСХАНА

## Ці здолее Манголія выкарабкацца з крызісу?



**Апошнім часам Манголія ўсё часцей аказваецца ў цэнтры ўвагі. Гэтую азіяцкую краіну эксперты нярэдка згадваюць як адну з найбольш перспектыўных дзяржаў макрарэгіёна. Між тым яшчэ да пачатку 2000-х сітуацыя была іншай: краіна заставалася ў цені сваіх магутных суседзяў — Кітая і Расіі. Манголію, пэўна, па завядзёнцы лічылі «тэрыторыяй качэўнікаў», дзе развіваецца бадай што жывёлагадоўля. Між тым у пачатку апошняга дзесяцігоддзя эканоміка Манголіі была адным з сусветных лідараў па тэмпах росту — яна падагравалася бурным развіццём Кітая і значнымі прамымі замежнымі інвестыцыямі. Але ўсё гэта скончылася ў 2015-м. А летась эканоміку краіны моцна «штарміла». Якая ж перспектыва ў «спадчыны Чынгісхана»?**

### ПАСЛЯ ІМПЕРЫІ

Археалагічныя раскопкі выявілі астанкі чалавека, датаваныя перыядам каля паўмільёна (паводле іншых крыніц, 850 тыс.) гадоў таму ў пустыні Гобі і іншых рэгіёнах Манголіі. Нягледзячы на непрацяглае лета, вырошчванне пшаніцы тут практыкавалася на працягу многіх тысячагоддзяў нароўні з жывёлагадоўляй, якая таксама актыўна развівалася, — манголы прыручылі коней, вярблюдаў і якаў.



Дарэчы, слова «мангол» было ўпершыню зафіксавана кітайцамі ў перыяд праўлення дынастыі Тэнгу (618—907 гады). У гэты час у Манголіі пераважалі цюркскія плямёны ўйгхураў. Яны панавалі да IX стагоддзя, пакуль не былі разгромлены кіргізамі, нашчадкі якіх, дарэчы, і цяпер жывуць у кітайскай правінцыі Сіньцзян. Манголы не жадалі аб'ядноўвацца з іншымі качавымі плямёнамі Паўночнай Азіі.

Аж да XII стагоддзя краіна ўяўляла сабой нешта накшталт нетрывалага саюза варагуючых кланаў, пакуль не з'явіўся 20-гадовы Цемучын, які здолеў аб'яднаць вакол сябе большасць мангольскіх плямёнаў. У 1189 годзе яму было нададзена ганаровае імя Чынгісхан, што азначае «ўсеагульны цар». Да яго смерці у 1227-м мангольская імперыя распасціралася ад Пекіна да Каспія.

Унук Чынгісхана Кублайхан завяршыў заваяванне Кітая, паклаў канец кіраванню кітайскай дынастыі Сонг і стаў першым імператарам дынастыі Юань. Замест таго, каб працягваць войны і захопліваць новыя тэрыторыі, ён сканцэнтраваўся на захаванні адзінства сваёй дзяржавы. Гэта быў перыяд росквіту Манголіі: імперыя распасціралася ад Карэі да Венгрыі, а на поўдні — да В'етнама. Гэта была самая вялікая імперыя з усіх, якія калі-небудзь існавалі ў свеце.

Пасля смерці Кублайхана ў 1294 годзе Манголія стала распадацца на часткі ў выніку міжусобнай барацьбы за ўладу. У сярэдзіне XIV стагоддзя манголаў выцесніў з Пекіна першы імператар дынастыі Мінь. А пасля падзення дынастыі Юань больш як 60 тысяч манголаў былі вымушаны вярнуцца ў Манголію. Адзінства было аслаблена: насоўваўся доўгі перыяд кланавых міжусобіц і распаду.

Праўленне Маньчжу было параўнальна спакойным для Кітая да 1800 года, але праўленне дынастыі Квінг аказалася выключна карумпаваным і дэспатычным. У 1911-м гэтая кітайская дынастыя пала. Манголія скарысталася момантам — было абвешчана аддзяленне яе ад Кітая і створаны тэакратычны ўрад пад кіраўніцтвам Джбцун Дамба VIII (Жывы Буда). 25 мая 1915 года быў падпісаны Дагавор К'якхта паміж Кітаем, Расіяй і Манголіяй, які гарантаваў апошняй абмежаваную аўтаномію.

### ПОКЛІЧ СТЭПУ

26 лістапада 1924 года была абвешчана Мангольская Народная Рэспубліка (МНР), і Манголія стала другой па велічыні камуністычнай дзяржавай у свеце. Да ўлады прыйшлі Пелжэдзіін Гендэн, Анандзін Амара і Харлагійн Чайбалсан. З 1934-га Сталін патрабаваў ад Гендена разгарнуць рэпрэсіі супраць будыйскага духавенства, чаго той не хацеў, бо быў глыбока рэлігійным чалавекам. Гендэн стараўся ўраўнаважыць уплыў Масквы і нават абвінавачваў Сталіна ў «чырвоным імперыялізме». За што і паплаціўся: у 1936 годзе быў зняты з усіх пасад і змешчаны пад хатні арышт, а затым «запрошаны» на адпачынак на Чорнае мора, арыштаваны і расстраляны ў Маскве. На яго месцы апынуўся Амара, які таксама быў неўзабаве зняты са сваіх пасад і расстраляны.

Крайнай стаў кіраваць Чайбалсан, які дакладна выконваў усе ўказанні Сталіна. З пачатку 1930-х гадоў набіралі сваю сілу рэпрэсіі па ўзоры савецкіх: былі праведзены калектывізацыя буйной рагатай жывёлы, знішчэнне будыйскіх манастыроў і «ворагаў народа» (у Манголіі да 1920 года прыблізна адна трэць мужчынскага насельніцтва былі манахамі і функцыянавала каля 750 манастыроў). Ахвярамі палітычных рэпрэсій у 1937—1938 гадах сталі 36 тысяч чалавек (каля 5% насельніцтва краіны), больш за палова з якіх — будыйскія манахі.

Распад СССР прывёў да канчатковага выхаду Манголіі ў «свабоднае плаванне». Але мала хто тут быў гатовы да такога «сцэнарыя». У сакавіку 1990 года буйныя дэманстрацыі адбыліся на плошчы перад будынкам парламента ва Улан-Батары, пачаліся шматлікія галадоўкі пратэсту. На падставе прынятага закона аб замежных інвестыцыях грамадзяне іншых дзяржаў атрымалі магчымасць валодаць акцыямі рознага тыпу прадпрыемстваў — ад фірмаў са 100-працэнтным замежным капіталам да сумесных кампаній. У маі 1991-га ўступіў у дзеянне закон аб прыватызацыі, згодна з якім дзяржаўная ўласнасць магла пераходзіць у рукі «заканапаслухмяных» грамадзян (тых, хто раней не здзяйсняў сур'ёзных злачынстваў), якія пастаянна пражываюць у краіне. Кожнаму грамадзяніну быў выдадзены адмысловы інвестыцыйны купон, які можна было купіць, прадаць ці ўручыць іншай асобе. Трымальнікі падобных купонаў станавіліся актыўнымі ўдзельнікамі спецыяльных аўкцыёнаў, з дапамогай якіх прыватызавалася дзяржаўная маёмасць. Пазней ліквідавалі «дзяржгасы» і кааператыўныя жывёлагадоўчыя аб'яднанні, пачалася перадача ў прыватную ўласнасць зямлі і жывёлы.

Камуністы пайшлі на пагадненне з іншымі партыямі, у выніку чаго 30 чэрвеня 1996 года была створана Мангольская Дэмакратычная Кааліцыя і 75-гадовы перыяд камуністычнага праўлення завяршыўся. На працягу наступных некалькіх гадоў урады, якія змяняліся адзін за адным, праводзілі празаходнюю палітыку рэформаў і прыватызацыі з прыцягненнем замежнага капіталу, але ў краіне ўсё яшчэ панавала галеча.

Пашавая жывёлагадоўля па-ранейшаму заставалася галоўным відам гаспадарчай дзейнасці. Дарэчы, Манголія і цяпер знаходзіцца сярод сусветных лідараў па пагалоўю жывёлы ў разліку на душу насельніцтва (прыблізна 20 галоў на чалавека). Нягледзячы на ўрбанізацыю стэпавы ўклад жыцця з'яўляецца вызначальным для манголаў. Нават у гарадах шмат насельніцтва жыве ў гэрах — белых ваўняных юртах, якія лёгка пераносіць з месяца на месца.

### БЕЗ «ПЛАНА Б»?

Манголія — вялікая па памерах краіна, яе плошча складае больш чым 1,5 млн кв. км. І адпаведна адна з самых маланаселеных у свеце (колькасць жыхароў — каля 3 млн). Паводле звестак МВФ, разведаныя запасы карысных выкапняў краіны, у тым ліку вугалю, медзі, жалеза і золата, ацэньваюцца ў 1—3 трыльёны долараў. У Манголіі 15 велізарных стратэгічных радовішчаў і сёння належным чынам эксплуатуецца толькі адно — Аюуталгой. Гэта не толькі краіна, набітая геалагічнымі багаццямі, але і бадай адзін з самых вялікіх у свеце і хуткарослых рынкаў сыравіны.

Яшчэ нейкія тры-чатыры гады таму перад Манголіяй, здавалася, адкрываліся самыя заманлівыя перспектывы. Кампаніі з Аўстраліі, Кітая, Расіі і Паўночнай Амерыкі энергічна здабывалі з нетраў разнастайныя карысныя выкапні, забяспечваючы манголаў добра аплачваемай работай. «На карце свету няма пункта, дзе б магчыма так лёгка здабыць прыродныя рэсурсы і прадаць іх у Кітай з мінімальнымі транспартнымі выдаткамі», — заўважыў фінансавы менеджар Landesbank Berlin Investment (кампаніі, што кіруе актывамі коштам 12 млрд долараў, куды ўваходзяць і намінаваныя ў мясцовай валюце мангольскія даўгавыя абавязацельствы) Луц Раймеер.

У перыяд дарагой сыравіны, пік якой прыйшоўся на 2011-ы, эканоміка Манголіі прырастала рэкорднымі тэмпамі (да 18% у год!). Узровень жыцця ў краіне няўхільна, як тады здавалася, павялічваўся. У гэты перыяд даход на душу насельніцтва дасягнуў прыкладна 4 тыс. долараў у год. Ідылія растварылася, як дым, у 2014 годзе, калі разам з рэзкім зніжэннем цэн на сыравіну на глабальных рынках пачалі гэтак жа хутка «перасыхаць» інвестыцыйныя патокі ў мангольскую эканоміку.

Цяпер сітуацыя ў Манголіі кардынальна адрозніваецца ад сітуацыі ў пачатку 2014 года. Рост эканомікі сёлета пад вельмі вялікім пытаннем. «Ніякіх замоў і чароўных палачак для імгненнага праведзення структурных змяненняў і вяртання да гадоў росквіту не існуе, — заўважыў часопісу Forbes Лі Кашэл, дырэктар Asia Pacific Investment Partners (APIP), адной з найбуйнейшых у Манголіі інвестыцыйных кампаній. — Калі краіна хоча атрымаць выгаду з росту попыту на сыравіну, то яе рынак павінен больш эфектыўна рэагаваць на павышэнне цэн на сусветных рынках».

Вызначыць корань бед Манголіі няцяжка. Краіна сутыкнулася з чарговай праявай так званага рэсурснага праклёну, калі багацце прыродных рэсурсаў можа прывесці да перакосаў эканамічнага росту, недзеяздольнасці ўрада і чарадзе ўзлётаў і падзенняў, якія могуць знішчыць фінансавую сістэму краіны. Больш за 80% мангольскага экспарту — гэта Кітай, эканоміка якога апошнія гады запавольваецца. Прафесар Кэры Браўн з Кітайскага інстытута Лау пры Каралеўскім каледжы Лондана заўважае: «Усё гэта пагражае Манголіі буйнымі праблемамі, паколькі нікая зразумелага «плана Б» ва ўрада няма. Сфера паслуг не развіта, застаецца толькі сельская гаспадарка».

Міжнародны валютны фонд прагназуе для мангольскай эканомікі ў гэтым годзе рост прыкладна на 1%. Гэта менш за палову леташняга паказчыка, а таксама самыя нізкія тэмпы развіцця сярод сямі так званых пагаменжых краін у Азіі, сітуацыю ў якіх маніторыць МВФ. Французскі інвестыцыйны банк Natixis увогуле не чакае сёлета росту пасля рэзкага леташняга скарачэння інвестыцый.



«Перыяд палітычнай стабільнасці павінен быць дастаткова доўгім, каб вярнуць у краіну прамыя замежныя інвестыцыі, — цытуе Forbes Лі Кашэла з APIP. — Цяперашняя сітуацыя і прагнозы па сыравіне сведчаць аб тым, што для ўрада МНР надыходзіць вельмі спрыяльны час для таго, каб скарыстацца магчымасцямі для ўмацавання стабільнасці».

Мангольскія эксперты запэўніваюць: краіна здолее выстаяць і надалей нарошчваць тэмпы эканамічнага развіцця. «У апошнія 10 гадоў ВУП Манголіі павялічыўся з 1 млрд да 12 млрд долараў, краіна стала сусветным лідарам па росце эканомікі. Цяпер мы павінны выходзіць на новы тэхналагічны ўзровень, каб да 2030 года павялічыць ВУП яшчэ ў чатыры разы. Рэзервы для гэтага ёсць», — заўважыў член праўлення Цэнтрабанка Манголіі Чулуундорж Хашчулуун. Ці спраўдзяцца гэтыя прагнозы? Час пакажа.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

■ Драматургія жыцця

# «ІНШАМУ І НА СВАБОДЗЕ НЕСВАБОДНА»

**У мужчынскай папраўчай калоніі паставілі спектакль. Усе акцёры — зняволеныя.**

**У буклеце побач з імёнамі выканаўцаў роляў аддрукаваныя артыкул Крымінальнага кодэкса, тэрмін пазбаўлення волі, пачатак зняволення, канец. Іграць на сцэне, яны кажуць, «крута, нават больш чым», хоць падыгрываюць ці сапраўды гэтым гараць — складана вызначыць. Каб увасобіць ідэю тэатра ў калоніі, сюды «са свабоды» запрасілі прафесійнага рэжысёра, які вырашыў папрацаваць з няскончанай аповесцю «А ранкам яны прачнуліся...» Шукшына. Канец зрабілі свой, атрымаўся ён пататычным: у фінале спектакля са сцэны гучыць песня «Ліст маці» Міхаіла Круга. У матуль, якія прыехалі на прэм'еру, цяклі слёзы... У папраўчай калоніі дзейнічаюць крыху іншыя законы драматургіі.**


Фота Надзеі БУЖАН.





У ВОГУЛЕ ў папраўчай калоніі №20, што пад Мазыром, многае, звязанае з тэатрам, — іншае. І пачынаецца ён не з вешалкі, і належная ўрачыстасць тут — не ўрачыстасць, і кветкі пасля паклонаў дораць не творчаму складу, а гасцям. Але клуб на тэрыторыі ўстановы, сцэна, заслона, закуліссе, «грымёрка», хваляванне перад спектаклем, апладысменты — усё, як трэба. 19 студзеня ў афішы — «А ранкам яны прачнуліся...». Спектакль паказваецца для зняволеных — цэлая зала з чорных роб. Асуджаныя прыйшлі паглядзець спектакль, які паказваецца тут толькі чацвёрты раз, а гледачом, здаецца, забяспечаны назаўсёды. Калі абстрагавацца ад знешніх прыкмет, то сам сэнс высокага мастацтва, якім з'яўляецца тэатр, яго ўплыў, напэўна, тыя ж, што і ўсюды.

«Што ні кажы, а мастацтва ўзвышае чалавека», — кажа рэжысёр пастаноўкі і галоўны рэжысёр Мазырскага драматычнага тэатра Раман Цыркін. З трупай яны аднадушныя. «Раман Мацвеевіч унёс такія станоўчыя карэктывы ў наш побыт, якія яго сапраўды красяць. Я першапачаткова не ўдзельнічаў у спектаклі, а ўжо ў працэсе замяніў чалавека, і мне, я скажу, гэта вельмі падабаецца. Іншым людзям у прынцыпе і на свабодзе бывае несвабодна, а тут — з тым, што ў нас адбываецца, — быццам адчуваеш сябе свабодным», — адазваўся выканаўца ролі Старшыны. «Кожны ў сабе нешта раскрыў, нешта зразумеў...» — гучыць з іншага боку. Кажуць, што пасля таго, як яны сталі пераадольваць хваляванне перад «натоўпам гледачоў», ім стала лягчэй камунікаваць і вырашаць паміж сабой бытавыя пытанні.

КАЛІ тут было вырашана паставіць спектакль, у калоніі павесілі аб'яву з запрашэннем на «кастынг». «Убачыў аб'яву, пачытаў — я яшчэ нейк не на волі ў падобным удзельнічаў — падумаў, чаму б не паспрабаваць. Сказалі, яшчэ і рэжысёр будзе». На ідэю ў выніку адгукнуліся дваццаць пяць чалавек, з якіх адабралі дзевяць. На сустрэчу з гэтай дзявяткай прыехаў Раман Цыркін і ўбачыў матываваных людзей, з якімі можна працаваць. Для тых, у сваю чаргу, сустрэча з прафесійным тэатральным пастаноўшчыкам стала яшчэ большай матывацыяй. «Было бачна, што пасля першай размовы з рэжысёрам яны натхніліся».

Некалькі месяцаў у групе працавалі, рэпеціравалі, мянялі склад, будавалі дэкарацыі, шылі касцюмы — усё сваімі сіламі. «У працэсе чытак мы вызначалі ролі. З той нагоды, што артысты непрафесійныя, акцёраў выбіралі па тыпажы. Рэпеціравалі адзін-два разы на тыдзень. Дэкарацыі хлопцы самі прапанавалі і зрабілі. Я прыехаў — ужо ўсё зроблена, а ў тэатры часам бегаеш і прымушаеш», — кажа рэжысёр.

Дзеянне п'есы адбываецца ў медвыцвярэзніку. Восем герояў прачынаюцца раніцай ад настойлівых крыкаў таварыша інтэлігентнага выгляду, які не ведае, дзе знаходзіцца. У гэтым памяшканні на працягу сарака хвілін разважаецца ўвесь сюжэт, халодны, іранічны. Дыялогі, сваркі, прыход прыбіральніка, візіт сацыёлага. Ніякага маралізатарства, ментарства, тыкання пальцам. Проста гісторыя, зразумелая зняволеным, а некаму, хто на асабістым вопыце знаёмы з падобнымі ўстановамі, нават блізкая. Незавершаную п'есу Шукшына скончылі навісным пытаннем, песняй і відэа, што нагадвае пра візіты блізкіх. Усё лавіруе паміж свабодай і несвабодай — напэўна, шчэміць.

«Камусьці здаецца, што гэта проста нейкае выступленне, а на самай справе мы шмат аб чым задумваемся. Мацней хочацца дадому, да родных, пастаянна нешта блізкае ўспамінаем, я стаў часцей пісаць лісты дадому, адпраўляю пару разоў на тыдзень».

ТЭАТРАЛЬНЫ гурток ужо дзейнічаў у калоніі №20: у 2006 годзе адзін са зняволеных праявіў сябе як сцэнарыст, і асуджаныя звярнуліся да адміністрацыі з жаданнем паўдзельнічаць у спектаклі. Аўтар сцэнарыя «Старасельскага дэтэктыва» — так называлася пастаноўка — стаў і рэжысёрам. Практыка работы тэатра ў калоніі аказалася тады настолькі незвычайнай, што адміністрацыя пайшла нават на тое, каб вывезці трупу і паказаць спектакль у гомельскай жаночай папраўчай калоніі №4, што патрабавала вялікіх высілкаў.

«Ідэя работы тэатральнага гуртка ў калоніі даўняя і для папраўчага працэсу мае вялікае значэнне, таму што асуджаныя могуць абстрагавацца, праявіць творчыя здольнасці, паказаць іншым, што энергію можна накіроўваць на карысную справу», — каментуе начальнік аддзела папраўчага працэсу Аляксандр Байцоў, дадаючы, што тэатр, акрамя іншага, можа павысіць імідж самой сістэмы.

На час адсутнасці рэжысёра каардынатарам групы быў прызначаны адзін са зняволеных. У яго, як мне падалося, з'явіліся нават пэўныя бацькоўскія пачуцці да каманды. Калі гаворка зайшла аб стаўленні да тэатра ў калоніі з боку іншых, той упэўнена парыраваў: «Яны, скажу шчыра, зайздросцяць. Таму што нашы хлопцы самі не чакалі таго, што атрымалася, яны на гэта нават не разлічвалі. Знялі, так бы мовіць, вяршкі. Усе ўдзелам у спектаклі задаволеныя. Мы прыцірaліся нейкі час, гэта зразумела — калектыў, без эмоцый не абыдзецца, але мы ішлі да мэты. Таму калі хлопцы ўбачылі, як да іх ставяцца, з авацыямі, крыкамі, калі нават сапраўдныя акцёры з драмтэатра прыехалі, яны заліліся чырванню. Праз пару дзён пасля пастаноўкі хтосьці ўжо падыходзіў да мяне і пытаўся, калі пойдзем рэпеціраваць. Мы сталі залежаць ад гэтага».

ТАМУ, хто грае ў тэатры — «рэспект» і «ўважуха». «Многія зняволеныя паводзяць сябе, як двоечнік на задняй парце: нічога не кажуць, не выконваюць просьбаў, уступаюць у пэўнае супрацьстаянне з адміністрацыяй. Але калі яны бачаць, што іншыя асуджаныя іграюць у тэатры і пры гэтым выдатна сябе адчуваюць, маюць зносіны з адміністрацыяй, упэўненыя ў сабе, іх уяўленні пачынаюць падрывацца, яны нават цягнуцца да членаў гуртка. Калі нам спатрэбілася зрабіць «ратацыю кадраў», акцёры знайшліся без праблем», — кажа Аляксандр Байцоў.

Гэта ўжо не першы іх выхад на сцэну. Дрыжыкі ў каленках, як хлопцы самі прызналіся, ёсць, але непараўнальныя з прэм'ерай, калі прыйшлося выйсці і ўпершыню разыграць перад іншымі п'есу Шукшына. На сцэне — нары, акцёры леглі пад белыя прасціны, каб, калі адкрыецца заслона, прачнуцца ўжо ў спектаклі.

«Я, калі першы раз іх убачыў... сядзіць дванаццаць чалавек, а вочы такія, прабачце, воўчыя, насцярожаныя. Маўляў, чаго ён прыехаў, чаго хоча, — кажа рэжысёр. — А потым сталі камунікаваць, і ўсё памянялася. Мне казалі, дысцыпліна ў калоніі палепшылася. Думаю, такія мерапрыемствы даюць больш, чым калі нехта прыйдзе і скажа, маўляў, піць нельга».

Пасля спектакля акцёры спяшаюцца на пастраенне, а Старшына не жадае выходзіць з ролі, так і стаіць у форме. Ёсць тут, у калоніі, сваё свята, наваспечаная трупа адзначыць поспех шакаладам. І хутка, напэўна, спытае, калі зноў на рэпетыцыі.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
katsyalovich@zviazda.by



# ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ

гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Домашаны, дер. Лужки, ул. Банная (по генплану №4), дер. Переездная (по генплану №5), дер. Рудомейка (участок №1), дер. Прилепская Усяжка, ул. Подгорная (участок №2) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | 2 марта 2017 года, в 11.00 ч., аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | Продавец и его адрес | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот 1 – площадь 0.1073 га, №624883003601000322, дер. Домашаны<br>Лот 2 – площадь 0,1455 га, №624883005601000178, дер. Лужки, ул. Банная (по гп. №4)<br>Лот 3 – площадь 0,0868 га, №624883008101000134, дер. Переездная (по гп. №5)<br>Лот 4 – площадь 0,1388 га, №624883008601000095, дер. Рудомейка (уч. №1)<br>Лот 5 – площадь 0,0921 га, №624883008201000113, дер. Прилепская Усяжка, ул. Подгорная (уч. №2) |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот №1 – 15000 рублей<br>Лот №2 – 20000 рублей<br>Лот №3 – 15000 рублей<br>Лот №4 – 15000 рублей<br>Лот №5 – 12000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики<br>В) без права предоставления рассрочки |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | дер. Домашаны – нет<br>дер. Лужки, ул. Банная (гп. 4) – подъездные пути, электричество, газ<br>дер. Переездная (по гп. 5) – подъездные пути, электричество<br>дер. Рудомейка – подъездные пути, газ<br>дер. Прилепская Усяжка, ул. Подгорная (уч. 2) – подъездные пути, электричество |
| 10 | Ограничения в использовании | лот 1 – водоохранная зона рек, водоемов<br>лот 5 – водоохранная зона реки Усяжа |
| 11 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 12 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка<br>р/с 3641000000614 ОАО «АСБ Беларусбанк» филиал 612, г. Борисов, ЦБУ 621, г. Смолевичи, УНП 600046563 МФО 153001810 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 13 | Порядок предварит. ознаком. в натуре с земельными участками | Среда в 10.00 |
| 14 | Прием документов | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 15 | Окончательный срок приема документов | 24 февраля 2017 года в 17.00 |
| 16 | Контактные телефоны | 8-01776-44-636, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот 1 – 1664,47 руб., лот 2 – 1712,50 руб., лот 3 –1542,72 руб., лот 4 – 1628,92 руб., лот 5 – 1550,82 руб. и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечание: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).
Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт), и копию паспорта покупателя или его доверенного лица и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).
3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Капитальное строение с инв. №200/С-86492, назначение – цех ремонта прицепов, общей площадью 1648,5 м кв., стоимостью 235 600,00 бел. рублей |
| Собственник (владелец) имущества | ООО «ЛоГоспроект» (УНП 390520621) |
| Местонахождение (адрес) имущества | Лот №1. г. Витебск, ул. Ленинградская, 217/7 |
| Наличие обременений | Залог ОАО «Белвнешэкономбанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 27.02.2017 в 11.00 часов<br>г. Витебск, ул. Кирова, д. 16, каб. 11 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска<br>210001, г. Витебск, ул. Кирова, д. 16.<br>Судебный исполнитель Мухина Наталья Михайловна, тел./факс (80212) 63-64-76, моб. +375-33-399-78-15, начальник отдела Зарецкая Елена Витальевна, тел. (80212)60-84-42 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска р/с №3642903000328 филиала №200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300002505, не позднее 09.00 24.02.2017 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 486 Гражданского процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

# ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов**

02.03.2017 г. в 10.00 по адресу:
Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

| № п/п | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка | д. Хоружинцы, ул. Лесная, 15, кадастровый номер 623288016101000067 | д. Мочулище, ул. Полевая, 1Б, кадастровый номер 623288010101000022 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, д. 15Б, кадастровый номер 623288016101000065 |
| Площадь земельного участка | 0,1284 га | 0,1599 га | 0,1521 га |
| Наименование инженерных сетей | | | подъездные пути удовлетворительные |
| Начальная цена (бел. руб.) | 2 478 руб. 92 коп. | 1 912 руб. 64 коп. | 2 398 руб. 69 коп. |
| Задаток (бел. руб.) | 495 руб. 78 коп. | 382 руб. 53 коп. | 479 руб. 74 коп. |
| Расходы по документации | 1 317 руб. 02 коп. | 1 562 руб. 04 коп. | 1 315 руб. 65 коп. |

Задаток перечисляется на р/счет №3600619171104 «АСБ Беларусбанк» код 795 УНП 600181536, ОКПО 04431642 Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится 02.03.2017 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 25.02.2017 г. (последний день подачи заявления 24.02.2017 г. до 17.00) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

**Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, 57 4 99.**

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

